Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 89 (3993)
СЕРАДА, 1 КРАСАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫЧНА

№ 65

Тварам да генэральнай праверкі

Заўтра першы дзень двухдэкадніка генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы. З заўтрашняга дня раённыя праверачныя камісіі па ўсіх сельсаветах, саўгасах і калгасах накіроўваюць брыгады, якія ў выніку сваёй работы павінны даць сапраўды рэальны разгорнуты малюнак выкананьня раёнамі дырэктыў партыі і ўраду ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны і мабілізаваць масы на ліквідацыю прарываў і выкананьне дырэктыў 6-га Усесаюзнага зьезду саветаў.

Такога становішча мы зможам дасягнуць толькі ў тым выпадку, калі РАЁННЫЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ І ЎСЕ ЯЧЭЙКІ КП(б)Б нададуць праверцы тое вялізарнае палітычнае значэньне, якое надае ёй усл КП(б)Б. Задачы генэральнай праверкі будуць выкананы толькі пры тэй ўмове, калі ўсе арганізацыі і ячэйкі КП(б)Б здолеюць правільна паставіць праверку і ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ КІРАЎНІЦТВАМ САМАЕ ЯЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ. Галоўнае і асноўнае ў гэтай адназьнейшай рабоце заключаецца ў тым, каб вакол задач генэральнай праверкі мабілізаваць і ўцягнуць у яе практычнае правядзеньне САМЫЯ ШЫРОКІЯ МАСЫ ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ, КАМСАМОЛУ, РАБОЧЫХ САЎГАСАЎ, КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ АДНААСОБНІКАЎ.

Толькі такая шырока-масавая праверка дасьць патрэбныя рэзультаты ў правядзеньні другой бальшавіцкай вясны. Прыступаючы да практычнага разгортваньня работы па праверцы, мы павінны рашуча папярэдзіць, што яна (праверка) павінна праводзіцца ня толькі сіламі ўпаўнаважаных брыгадзіраў раёну па сельсаветах, ня толькі тымі таварышамі, якія былі не працягу ўсяго пэрыяду падрыхтоўкі да сяўбы прымацаваны да тых ці іншых калгасаў або населеных пунктаў. Трэба дабіцца такога становішча, каб за ход праверкі, а разам з тым і зь самую падрыхтоўку да бальшавіцкай вясны ў першую чэргу адказвала мясцовая партыйная ячэйка калгасу ці сельсавету, каб за ажыцьцяўленьне гэтых важнейшых задач адказвала праўленьне калгасу, сельсавет і кожны работнік паасобку. Практыка правядзеньня генэральнай праверкі ў мінулым годзе паказала, што ў некаторых асобных раёнах не надавалі гэтай важнейшай рабоце масавасьці, імкнуліся правесьці яе выключна праз «спэцыяльных упаўнаважаных». Зразумела, у такіх раёнах мы ня мелі таго сапраўднага руху ў справе падрыхтоўкі да сяўбы, які павінна была ўнесьці генэральная праверка. Гэтай недапушчальнай практыкі, якая мела месца ў некаторых асобных раёнах у мінулым годзе, мы ні ў якім разе не павінны паўтарыць зараз.

ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ, КАМСАМОЛ, ПРАФСАЮЗЫ, СЕЛЬСАВЕТЫ і ўсе ГРАМАДЗКІЯ арганізацыі павінны быць прыведзены ў рух,—усе іх сілы павінны быць кінуты на правядзеньне генэральнай праверкі. Толькі пры гэтым мы зьліквідуем тыя прарывы, якія мелі і маюць месца ў падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны.

Некалькі дзён таму назад намі апублікаваны ліст да ўсіх райкомаў, райКК і райза адносна генэральнай праверкі. У гэтым лісьце подана праграма канкрэтных дзеяньняў. Гэты ліст павінен стаць ня толькі прадметам шырокага абмеркаваньня на пасяджэньнях бюро ўсіх райкомаў, на ячэйках партыі і камсамолу, прэзыдыумах райвыканкомаў, профсаветаў і ўсіх інш. арганізацый, але кожная з іх павінна вызначыць тыя канкрэтныя мерапрыемствы, якія яна павінна правесьці. Праграма праверкі вызначае 5 асноўных і вузлавых пытаньняў, па якіх павінна праводзіцца работа. Двухдэкаднік генэральнай праверкі павінен даць зусім выразны і поўны адказ на ўсе пытаньні, пастаўленыя праграмай. Ня сухім, не фармальна-бюракратычным павінен быць гэты адказ. Ён павінен зусім выразна акрэсьліць сапраўдны стан падрыхтоўкі да сяўбы. Толькі такі адказ дазволіць партарганізацыям на-хаду пераключыцца на ліквідацыю прарываў, націсьнуць на вузкія месцы, якія былі і ёсьць у падрыхтоўцы да палявых работ. Разам з гэтым праверка, якая будзе адбывацца непасрэдна ў раёнах, у саўгасах, калгасах і населеных пунктах, выявіць як цэнтральныя ўстановы — Наркамзем, Калгасцэнтр і іншыя кіраўлі і кіруюць важнейшым вучасткам работы.

Пры правядзеньні генэральнай праверкі, не прапускаючы ніводнага пункту, вызначанага праграмай, мясцовыя партарганізацыі асаблівую ўвагу павінны аддаць наступным трох важнейшым пытаньням. Гэта — РАЗГОРТВАНЬНЕ РАБОТЫ ПА КАНТРАКТАЦЫІ, АРГАНІЗАЦЫЯ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ І ПРАВІЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ, г. зн. УВЯДЗЕНЬНЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ. Па кантрактацыі да першага красавіка павінна быць СКОНЧАНА ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ ДАГАВАРОЎ. Між тым, на 25 сакавіка для кантрактацыі, вярней заключэньне дагавораў, праведзена толькі на 15 проц. Рад раённых партарганізацый ня ўжываюць рашучых крокаў для ліквідацыі гэтага недапушчальнага адставаньня. Праверка работы партыйных арганізацый на гэтым адказнейшым вучастку павінна ўнесьці карэнны пералом.

КП(б)Б паставіла задачу да веснавой сяўбы мець 30 проц. калектывізаваных бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. Поляўя работы пачнуцца літаральна праз некалькі дзкад. А на сёнешні дзень процант калектывізацыі крыху перавышае лічбу 20. Рад партарганізацый не разгарнулі па-бальшавіцку работы па арганізацыі калгаснага прыліву. Праверку трэба злучыць з разгортваньнем і разьвіцьцём масавага прыліву бяднацка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы. У нас, у БССР, у радзе калгасаў дрэнна арганізавана праца. Яшчэ ў многіх калгасах панае падзёншчына, якая не дазваляе гаспадарча замацаваць калгасы, нападзіць правільнае разьмеркаваньне ўраджаю. Праводзячы праверку падрыхтаванасьці да сяўбы, трэба правесьці і адначасова дапамагчы калгасам правільна расставіць свае сілы, правільна арганізаваць працу, парайсьці на зьдзельшчыну. Ужо зараз кожны калгасьнік павінен ведаць, якую работу і з якой брыгадай ён мае выконваць у часе палявых работ. ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА праз брыгадныя формы і мэтады павінна быць уведзена ва ўсіх без выключэньня калгасах.

Масавая работа сярод АДНААСОБНІКАЎ — БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ па падрыхтоўцы да вясны аднаасобных гаспадарак, па ўцягненьні іх у калгасы —важнейшыя задачы парт'ячэйкі ў часе праверкі.

На працягу двухдэкадніка генэральнай праверкі партыйныя ячэйкі павінны арганізаваць пробныя выезды ў поле і гэтым самым выявіць наколькі калгасы гатовы сустрэць ва ўсеўзбраеньні палявыя работы. Інвэнтар, вупраж, харчовыя рэзэрвы і ўсе іншыя пытаньні, ад якіх проста ці ўкосна залежыць пасьпяховасьць у правядзеньні палявых работ, трэба паставіць на парадак дня кожнай ячэйкі, прычым пры іх вырашэньні надаць ім больш канкрэтнасьці і практычнасьці.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на становішча цягавай сілы і ў першую чаргу зьвярнуць увагу на калгаснага каня і мабілізацыю кармавых фондаў для яго.

Генэральная праверка праводзіцца ў пэрыяд разгортваньня адказнейшай работы — ПЕРАВЫБАРАЎ НІЗАВЫХ ПАРТОРГАНАЎ, вясковых арганізацый. Умелая ўвязка гэтых двух адказнейшых работ дасьць вялікі плюс для іх правядзеньня. У часе перавыбараў будзе шырока праварацца дзейнасьць ячэйкі на фронце змаганьня за новыя калгасы, за бальшавіцкую вясну. А генэральная праверка пры сваім практычным правядзеньні, выпуўле наколькі парт'ячэйка спраўлялася з выкананьнем сваіх непасрэдных задач. Гэтыя дзьве задачы трэба шчыльна яднаць з другой увязкай — мы атрымаем посьпехі у іх ажыцьцяўленьні.

Выкрываючы правых апартуністаў і гэроэму самацёчных настрояў, даючы бязьлітасны адпор кулацкаму супрацьціўленьню, рашуча змагаючыся з «левымі» перагібамі, партыйныя арганізацыі генэральную праверку правядуць па-бальшавіцку, дабіўшча новых гігантаў посьпехаў у змаганьні за сацыялістычную вёску, у ажыцьцяўленьні гістарычных пастаноў VI Усесаюзнага зьезду саветаў.

Бальшавіцкай вясьне—бальшавіцкую сустрэчу

РАБОТУ ПА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ не адрываць ад гаспадарчага замацаваньня калгасаў

Закончыць афармленьне новых калгасаў, абагуліць цягавую сілу, кармавыя і насенныя фонды, разгортваючы новы калгасны прыліў

Прапрацоўка пастаноў VI зьезду саветаў выклікае новы прыліў

ПАРТЫЙНАЯ, КАМСАМОЛЬСКАЯ ЯЧЭЙКА І КАЛГАСНЫ АКТЫЎ КАЛГАСУ «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», БРОСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, АРГАНІЗАВАЛІ ВЫХАД У ВЁСКУ ВОРСКІ, ДЗЕ БЫЎ ПАСТАЎЛЕН ДАКЛАД АБ ВЫНІКАХ VI ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ, У ВЫНІКУ ДАКЛАДУ І РАСКАЗАЎ КАЛГАСЬНІКАЎ АБ КАЛГАСНЫМ ЖЫЦЬЦІ, У ВЁСЦЫ АРГАНІЗАВАЎСЯ НОВЫ КАЛГАС «ПРАЎДА», У ЯГО ЎВАЙШЛО 14 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

НА СХОДЗЕ БЕДНЯКОЎ ВЁСКІ МАКАРЭВІЧЫ, ГЭТАГА-Ж СЕЛЬСАВЕТУ ПАСЬЛЯ ДАКЛАДУ АБ ПАСТАНОВАХ VI ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ СССР БЕДНЯКІ ПАСТАНАВІЛІ ЎСІМ УСТУПІЦЬ У КАЛГАС ІМЯ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ І ЗЬЯВЯРНУЛІСЯ З ПРОСЬБАЙ ДА СЕЛЬСАВЕТУ І ПАРТЫЙНАЙ ЯЧЭЙКІ АБ ХУТЧЭЙШЫМ АФАРМЛЕНЬНІ ЎСТУПЛЕНЬНЯ.

МАГІДАЎ.

***

АСЬВЕЯ.

Беднякі і сераднякі вёсак Родзікі, Зашчырына і Мышына, Сенькаўскага сельсавету, абмеркаваўшы пастановы X Усебеларускага зьезду саветаў, пастанавілі арганізаваць калгас.

У новы калгас адразу-ж запісалася 30 гаспадарак. Калектыў абгаварыў статут і пачаў падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

М. Зашчарынскі.

Ад 16 проц. да 44 проц.

КАСЬЦЮКОВІЧЫ.

Красьніцкі сельсавет стаў амаль на апошнім месцы па калектывізацыі. Пасьля абвяшчэньня сталінскага прызыву ў калгасы партыйная ячэйка сельсавету актыўна ўзялася за разгортваньне масавай работы, мабілізаваўшы ўвесь актыў. Выпікі такія. Да 1 сакавіка сельсавет быў калектывізаваны на 16 проц. За час сталінскага прызыву процант калектывізаваных гаспадарак вырос да 44.

Паступлеьне заяў ад беднякоў і сераднякоў аб прыёме ў калгас працягваецца.

Сьнітно.

Няма гаспадарчай работы, няма прыліву

СЬВІСЛАЧ.

Работа па калектывізацыі і падрыхтоўка да сяўбы разгортваюцца ў Сьвіслацкім раёне ляўна нездавальняюча. За апошнюю дэкаду арганізаваны ўсяго адзін калгас з 12 гаспадарак. Прыліў у існуючыя калгасы складае 40 гаспадарак. Раён калектывізаваны на 16 проц.

Такія павольныя тэмпы калектывізацыі тлумачацца невыстарчальнасьцю масавай работы і стаўкай на самацёк у радзе сельсаветаў.

Тая-ж апартуністычная стаўка на самацёк зьяўляецца асноўнай прычынай марудных падрыхтоўкі да вясны. Так, аўчыстка насеньня, рамонт і іншыя вытворчыя мерапрыемствы яшчэ ні ў адным сельсавеце ня скончаны.

Я. БУЛАТ.

Над гаспадарчым замацаваньнем калгасаў не працуюць

Вупа. (Наш. кар.).

Пытаньнем арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў у Вульскім раёне аддаецца ляўна невыстарчальная ўвага. Аб гэтым гаворыць рад наступных фактаў.

У райбанку да гэтага часу ўсё яшчэ ляжаць невыкарыстанымі 2.700 руб. з фонду калектывізацыі на ўступныя ўнёскі для беднякоў і беднякоў. Таксама на выкарыстаны 1.000 руб. раённага спажывецкага т-ва па калектывізацыі батракоў і беднякоў.

Кредыты на закупку інвэнтару і на жывёлагадоўлю разьмеркаваны народзе прыпыну «ўраўнілаўкі». Ня ўлічылі вапрамку гаспадаркі і не запраўдных патрэбнасьцяй, а разьмяркоўвалі выходзячы з разьмеру плошчы, якую займае той ці іншы калгас. У выніку гэтага змазваецца спэцыялізацыя калгасаў.

На складах ляжаць машыны і інвэнтару на 25 тыс. руб. Сем вагонаў мінэральных угнаеньняў да гэтага часу не забраны з Вобалі.

А. Мікуцкі.

Шырыцца сталінскі прыліў

СЬМІЛАВІЧЫ.

За апошні час сталінскі прызыў у калгасы запалыхаў у радзе сельсаветаў Сьмілавіцкага раёну. У вёсцы Харэвічы арганізаваўся калгас «Чырвоны Партызан», які аб'ядноў 18 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

У калгас «Дружба» ўступіла 5 адназасобнікаў.

Т. ШАЛАБОДАЎ.

Афармленьне новых калгасаў зацягваецца

МСЬЦІСЛАЎЛЬ.

За апошнія дзьве з паловай дэкады — з 1 па 25 сакавіка ў Мсьціслаўскім раёне арганізаваны 34 новыя калгасы, у якія ўлілося 56 гаспадарак. Прыліў у існуючыя калектывы складае 300 двароў.

Тэмп калектывізацыі за апошнія часы ўзрос у два разы. Замест 14,7 проц. у лютым мы маем 30 проц. на 25 сакавіка.

Гэтыя посьпехі зьяўляюцца вынікам вялікай масавай работы, якая разгарнулася ў радзе сельсаветаў.

Бясспрэчна, што выпікі маглі быць яшчэ большымі, калі-б усе мясцовыя арганізацыі пераключыліся на баявое выкананьне дырэктыў партыі аб сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі. Аднак, некаторыя арганізацыі, як напрыклад, райкалгассаюз і МТС яшчэ не скарыстоўваюць усіх магчымасьцяй, каб узьняць хвалю калектывізацыі на належную вышыню. Наглядаюцца факты, калі афармленьне дзесятку калгасаў зацягваецца зямельна-калгаснымі органамі на цэлыя тыдні.

Афармленьне раду калгасаў тармозіцца між іншым з-за адсутнасьці статутаў сельска гаспадарчай арцелі. Пасьля дзесятку тэлеграм Белкалгасцэнтр урэшце выслаў 100 статутаў, але... на ідышскай мове. Гэта не дае магчымасьці скарыстаць іх для беларускіх калгасаў.

Адначасова трэба падкрэсьліць, што ажыцьцяўленьне вытворчых мерапрыемстваў да вясны праходзіць яшчэ нездавальняюча і адарвана ад калектывізацыі. Раённымі арганізацыямі аддаецца ляўна невыстарчальная ўвага неадкладнаму замацаваньню новых калгасаў у тым напрамку, каб яны зараз-жа пасьля афармленьня прыступілі да засьвоенькі насенных фондаў, абагуленьня рабочых коняй і г. д.

Я. Вайштэйн.

„Прыдзе вясна, самі прыдуць у калгас"

МАЗЫР.

Аб тэмпах калектывізацыі ў Мазырскім раёне яркі малюнак даюць наступныя лічбы. Да 1 студзеня было калектывізавана 15,7 проц. гаспадарак, а на 1 сакавіка гэты процант узрос толькі да 19.

Такім чынам, работа па арганізацыі новага калгаснага прыліву зьяўляецца ляўна невыстарчальнай. Гэта тлумачыцца правааапартуністычнай стаўкай на самацёк, якая наглядаецца ў значнай частцы сельсаветаў. Нізавыя арганізацыі гэтых сельсаветаў разважаюць так:

— Прыдзе вясна, самі прыдуць у калгасы.

Ня лепш малюнак падрыхтоўкі да вясны, асабліва па індывідуальным сэктары. Аднаасобнікі яшчэ фактычна не прыступілі да складаньня страхавых фондаў. Заданьне па ачыстцы насеньня выканана толькі на 23,9 проц.

Па калгасным сэктары збожжа ачышчана на 90,5 проц., але рамонт не пасоўваецца наперад. Рамонтныя майстэрні не загружаны. Сельска-гаспадарчыя машыны і ўгнаеньне ў калгасы не прасунуты. Плян гатункавбмену выканан усяго на 4,7 проц. Фуражныя фонды на калгасах ня складзены.

Такая нездавальняючая работа па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны тлумачыцца, галоўным чынам, стаўкай на самацёк, якая праяўляецца з боку работнікаў раённых і нізавых арганізацый. Неабходна ўдарыць па канкрэтных посьбітах правай практыкі, мабілізаваўшы масы на ліквідацыю прарываў.

З. З-н.

Пасеўная—на тормазах

ЛАГОЙСК. За апошні час работа па калектывізацыі значна пашырылася. На сёнешні дзень рабіі калектывізаваны на 35 проц.

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў раёне поўнасьцю адарвана ад работы па разгортваньні калектывізацыі. Калгасы да сустрэчы вясны не гатовы. Так, калгас «Бальшавік», які знаходзіцца ў центры раёну, да гэтага часу ня скончыў [illegible] не адрамантаваў с.-г. інвэнтар. Такое-ж [illegible] становішча і на калгасах імя АБВІІ, «Чырвоны [illegible], «Перемога» [illegible].

Камітэты сялянскай узаемадапамогі стаяць у баку ад падрыхтоўкі да вясны. Работа з беднатой не праводзіцца.

Раённыя арганізацыі павінны ўвязаць паміж сабою правядзеньне гэтых важнейшых кампаній. Тэмпы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы павінны быць безадкладна ўзмоцнены.

17 НОВЫХ КАЛГАСАЎ

КРУГЛАЕ. У Круглянскім сельсавеце калгасы і аднаасобнікі па-бальшавіцку рыхтуюцца сустрэць веснавую сяўбу.

Калгасы «Пралетары», «III Інтэрнацыонал», «Чырвоны Кастрычнік», «Зямляроб», «Чырвоны камунар», «Кастусь Каліноўскі», імя 1-га Мая на сёнешні дзень ужо поўнасьцю адрамантавалі ўвесь с.-г. інвэнтар і ачысьцілі насьценне. Усе гэтыя калгасы поўнасьцю гатовы да выхаду ў поле.

Кожны [illegible] і інвэнтар [illegible] не забраць ня менш 10 стр. [illegible].

Бальшавіцкія тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы значна спрыяюць узмоцненьню калгаснага прыліву. За час кампаніі ў гэтай кампаніі да сяўбы на раёне арганізавана 17 новых калгасаў.

Н.

Мы ператвараемся ў краіну самай буйной, самай перадавой сельскай гаспадаркі

У 1931 годзе наша краіна, **уступіўшы ў першую фазу сацыялізму, завяршае на базе НЭП'у, яго апошняй стадыі, пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі.** Пытаньне аб перамозе сацыялізму ў нашай краіне вырашана, і перамога сацыялізму з пункту гледжаньня ўнутраных суадносін клясавых сіл забясьпечана. У гэтым — сусьветна-гістарычная сутнасьць сучаснага этапу нашага разьвіцьця.

Этап, які намі перажываецца, генэральна прадбачыў Уладзімер Ільліч яшчэ на зары НЭП'у, на X зьезьдзе партыі.

«Мы дасканала ведаем, — гаварыў Ленін, — што ў нас клясы засталіся і застануцца, што ў краіне з пераважным селянскім насельніцтвам яны нямінуча застануцца доўга, шмат год. Мінімальны тэрмін, на працягу якога можна было-б паладзіць буйную прамысловасьць, каб яна стварыла фонд для падпарадкаваньня сабе сельскай гаспадаркі, вылічаецца ў 10 год. Гэта тэрмін — мінімальны пры нячувана спрыяючых тэхнічных умовах. Мы-ж ведаем, што мы знаходзімся ва ўмовах нячувана няспрыяючых». (Том XVIII, ч. 1 стар. 143-144).

10 год НЭП'у ў нашай краіне ва ўмовах «нячувана няспрыяючых» (капіталістычнае акружэньне, нізкі тэхнічны ўзровень нашай эканомікі, разруха год ад 1921 г., распачлівае супраціўленьне аджывалых эксплёататарскіх кляс у нашай краіне, бюракратызм і г. д.) аказаліся выстарчальнымі для таго, каб нячувана бурнымі тэмпамі пабудаваць буйную, максымальна скансэнтраваную, сацыялістычную прамысловасьць, падаўшы яе цясьнейшае змыканьне з сельскай гаспадаркай, якая сацыяльна і тэхнічна рэканструюецца на аснове будаўніцтва саўгасаў, калгасаў і машынна трактарных стацый.

Пройдзенае дзесяцігодзьдзе НЭП'у, як нельга лепш, характарызуе новую эканамічную палітыку, як палітыку, разьлічаную на перамогу сацыялізму ў нашай краіне.

Наша партыя вытрымала сур'ёзныя баі як з троцкісцкімі элемэнтамі, так і з правымі, якія прабавалі на кожным гістарычным павароце нашай палітыкі рэвізаваць асноўныя ленінскія палажэньні палітыкі НЭП'у, разьлічанай на «ператварэньне Расіі нэпаўскай у Расію сацыялістычную».

Прайшоўшае дзесяцігодзьдзе НЭП'у з выключнай яркасьцю характарызуе непахісную правільнасьць ленінскіх палажэньняў, правільнасьць ленінскай палітыкі нашай партыі. Дзесяць год, прайшоўшыя з моманту пераходу на рэйкі новай эканамічнай палітыкі, адзначаюцца ўступленьнем нашай краіны ў першую фазу сацыялізму, завяршэньнем пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне ўжо ў гэтым трэцім годзе пяцігодкі.

Сацыялістычны сэктар трымае ў сваіх руках усе гаспадарчыя вагары ўсёй народнай гаспадаркі. Асабліва значныя гістарычныя посьпехі нашай партыі ў галіне сацыялістычнай перабоўкі сельскай гаспадаркі, дасягнутыя на базе быстрых тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі XVI зьезд партыі, а за ім і VI Усесаюзны зьезд саветаў адзначылі ранавочыя зрухі ў калгасным руху за апошнія гады, якія характарызуюцца моцным паваротам асноўных мас сялянства на шлях калектывізацыі. «Рашучы вынік калгаснага руху за мінулы год — [illegible] VI зьезду саветаў на [illegible] сельскай гаспадаркі. У 1931 г. [illegible] Якаўлева, — заключаецца ў тым, што калгасны шлях праваран мільёнамі сялян на ўласным вопыце і ацэнен імі, як адзіны шлях, які вызваляе іх ад нацыскай кабалы і вядзе да свабоднага калгаснага жыцьця».

Пастаўленая партыяй задача ахапіць калгасамі ў 1931 годзе па ўсім СССР ня менш 50 проц. сялянскіх гаспадарак будзе ажыцьцёўлена. Выкананьне адзінага народна-гаспадарчага плану гэтага году забясьпечыць на справе завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне.

Але што значыць пабудаваць эканамічны фундамант сацыялізму?

Тав. Сталін у сваім даклядзе па пазыраным пленуме ВККІ ў 1927 г. так адказвае на гэта пытаньне:

«Стварыць эканамічную базу сацыялізму — гэта значыць злучыць сельскую гаспадарку з сацыялістычнай індустрыяй у адну цэльную гаспадарку, падпарадкаваць сельскую гаспадарку кіраўніцтву сацыялістычнай індустрыі; нападзіць адносіны паміж горадам і вёскай на аснове простага абмену прадуктаў сельскай гаспадаркі і індустрыі, закрыць і ліквідаваць усе каналы, пры дапамозе якіх нараджаюцца клясы і нараджаецца перш за ўсё капітал, стварыць, урэшце, такія ўмовы вытворчасьці і размеркаваньня, якія вядуць проста і непасрэдна да зьнішчэньня кляс».

Нашы гістарычныя посьпехі навочна расшыфроўваюць гэту клясычную фармулёўку тав. Сталіна. І сапраўды, да 1928-29 году аграмаджаны сэктар займаў у асноўных фондах народнай гаспадаркі каля 50 процантаў, а ў 1929-30 годзе — ужо 62 проц. Допя аграмаджанага сэктару ва ўсім народным даходзе ў бягучым годзе складае каля 81 проц. У прадукцыі ўсёй прамысловасьці (уключаючы і дробную) аграмаджаны сэктар займаў у 1928-29 г. 89,7 проц., а ў 1929-30 г. — ужо 94,5 проц. Удзельная вага неаграмаджанага сэктару ў 1931 г. будзе выяўляцца ў долях процанту. Зусім відавочна, што пытаньне «хто — каго» зьнята ў прамысловасьці, яно вырашана беспаваротна ў карысьць сацыялізму.

У галіне сельскай гаспадаркі мы маем сусьветна-гістарычныя посьпехі. У 1928 г. яднаўся ў калгасах 400 тыс. гаспадарак, у 1929 г. — 1 млн., у 1930 годзе — 6 млн., а на 10 сакавіка 1931 году ўжо 9.400 тыс., або 37 проц. усіх бяднацкіх і серадняцкіх гаспадарак Саюзу ССР. Прытым па асноўных збожжавых раёнах (Паўночны Каўказ, Н. Волга, спажывецкія паласы Украіны, Крым, Заволжа, Сярэд. Волга) калгасамі ахоплена з млн. гаспадарак, або 74 проц. усіх бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Далейшае будаўніцтва саўгасаў і МТС, ахоп калгасамі па ўсім СССР ня менш 50 проц. усіх сялянскіх гаспадарак, завяршэньне ў асноўным суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва ў галоўнейшых збожжавых раёнах вырашае у ГАДЗЕ ў асноўным пытаньне «хто каго» ў сельскай гаспадарцы. Тав. Молатаў на VI зьезьдзе саветаў СССР зусім правільна акрэсьліў тэмп, рашаючы год пяцігодкі, як рашаючы год у галіне зжыцьцяўленьня праграмы калектывізацыі Саюзу, намечанай партыяй і савецкай уладай.

Мы сапраўды ідзем па шляху змаганьні ў аграмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі складуць 3.840 млн. р. Цяперашні год зьявіцца годам буйнейшых тэхнічных зрухаў у матар'яльным узбраеньні сельскай гаспадаркі. Магутнасьць усяго трактарнага парку павялічыцца (арыентавана) з 900 тыс. конскіх сіл у 1930 г. да 2.166 тыс. конскіх сіл у 1931 г. Колькасьць МТС у гэтым годзе даводзіцца да 1.400 (да вясны — 1.027), машынаазбесьпячэньне павялічваецца з 449 млн. руб. у 1930 г. да 766 млн. руб. у 1931 г. Мы будуем буйнейшыя ў сьвеце гіганты сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва, трактарабудовы, камбайнаў і інш. для ажыцьцяўленьня быстрых тэмпаў сацыялістычнага ператварэньня сельскай гаспадаркі.

Уся гэта праграма ёсьць праграма разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце. Нашы посьпехі на ўсіх рашаючых вучастках сьведчаць аб тым, што мы грунтоўна ўзмацняем сацыялістычныя камандныя вышыні ў нашай краіне.

На канфэрэнцыі работнікаў сацыялістычнай прамысловасьці т. Сталін з усёй рэзкасьцю паставіў пытаньне аб аўладаньні тэхнікай, бо тэхніка ў пары-ваючай рэканструкцыі вырашае ўсё. «Мы, — сказаў тав. Сталін, — вырашылі рад цяжэйшых задач. Мы скінулі капіталізм. Мы пабудавалі буйнейшую сацыялістычную індустрыю. Мы павярнулі серадняка на шлях сацыялізму. Самае важнае, з пункту гледжаньня будаўніцтва, мы ўжо зрэбілі. Нам засталося нямнога: вывучыць тэхніку, аўладаць навукай. І калі мы зробім гэта, у нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх зараз мы ня можам і марыць. І мы гэта зробім, калі захочам гэтага па-сапраўднаму».

Аўладаць тэхнікай, аўладаць усімі працэсамі вытворчасьці, сацыялістычнай эканомікай — гэта значыць нанесьці канчатковы ўдар па клясавым ворагу. Аўладаць калгасным вытворствам, саўгасным вытворствам — гэта значыць канчаткова выбіць з рук кулака яго карты, ліквідаваць эканамічную базу яго існаваньня зламаць яго нелёнае супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню.

Характэрнае праяўленьне клясавай барацьбы ў цяперашні час заключаецца ў кулацкім шкодніцтве ўнутры калгасаў, у псаваньні і паломках калгасных маемасьці, машын, жывой цягі, насеньня і г. д. Гэта стаўка клясавага ворага мае зусім выразны мэтавы рэпрамак— аслабіць, абяскровіць гаспадарчую магутнасьць калгасаў, выкідаць нездавальненьне калгаснікаў дыскредытаваць калгасы перад тымі бяднацка-серадняцкімі масамі, якія яшчэ не ўвайшлі ў калгасы.

Кулакі, якія пралезьлі ў рады калгасаў, становяцца незамененымі «спэцыялістамі». Аўладаўшы гаспадарчым вагаром калгасу — вытворчасьцю, яны аддзяляюць ад гаспадарчага кіраўніцтва беднякоў і сераднякоў, як «цяпнытных». Апартуністычныя элемэнты не выкрываюць кулацкіх «спэцаў», якія займаюцца пад гэтай маркай шкодніцтвам. Адзін з карэньняў слабой барацьбы з падобнага роду кулацкай тактыкай і маскаваньнем ляжыць бясспрэчна в тым што касковыя камуністы, кіраўнікі [illegible] паделі яшчэ калгасным вытворствам, не аўладалі яшчэ ўсімі пазыцыямі гаспадаркі.

Зараз калгасны шлях, як адзіны шлях, сапраўды накіраваны на рашучага паляпшэньня становішча бяднацка-серадняцкіх мас і вызваленьня іх з кулацкай кабалы, праверана на вопыце мільёнаў сялян. Гэтыя мільёны на практыцы пераканаліся ў перавазе калгасаў. Асноўным-жа і зьвяцьцем ворагам калгаснага руху быў і ёсьць кулак. І «цяпер, калі шматмільённыя масы беднякоў і сераднякоў, пераканаўшыся ў перавагах калгасаў, уступілі на калгасны шлях, а кулацтва — асноўны вораг калгасаў — ліквідуецца як кліса, перад кожным бядняком і серадняком — аднаасобнікам, яшчэ ня ўступўшым у калгас, паўстала пытаньне — за ці супроць калгасу».

Зусім ясна, што бядняк і серадняк, які дапамагае асноўнаму зьлёгчаму ворагу калгаснага руху змагацца з калгасамі, падрываць калгасы, ня можа быць названы саюзьнікам і тым больш апорай рабочае клясы. Такі серадняк бядняк на справе ператвараецца ў саюзьніка кулака. VI усесаюзны зьезд саветаў правільна таму падкрэсьлівае ў рэзалюцыі па дакладу тав. Якаўлева, што «толькі той бядняк і серадняк — аднаасобнік застаецца і надалей саюзьнікам рабочае клясы, хто разам з рабочай клясай дапамагае будаваць калгасы, хто падтрымлівае калгасны рух, хто дапамагае весьці рашучую барацьбу з кулаком. Для таго, каб стаць сапраўднай і моцнай апорай савецкай улады перад бедняком і серадняком — аднаасобнікам адзін шлях — шлях дапамогі калгасам, а потым і ўступленьня ў калгасы».

Паступальны рост калектывізацыі сьведчыць аб тым, што новыя мільёны сялянскіх гаспадарак ужо вырашылі пытаньне аб тым, з кім ім ісьці. Яны вырашылі ісьці з рабочай клясай і ўсім калгасным сялянствам за калгасы, супроць кулака.

Але было-б трубейшай палітычнай памылкай думаць, што гэта зьнікне ў якой-небудзь ступені пытаньне аб [illegible] арганізацыйнай і выхаваўчай растлумачальнай рабоце, накіраванай дадзенай калектывізацыі бяднацка-серадняцкіх мас. Ажыцьцяўленьне бальшавіцкіх тэмпаў калектывізацыі патрабуе ў першую чаргу непрымірымай барацьбы з палітыкай і практыкай правааапартуністычнага самацёку. Па стаўцы на самацёк павінен быць нанесены асноўны і галоўны ўдар. Подач з гэтым трэба даваць бязьлітасны адпор усялякім спробам падмяніць цярпеливую растлумачальную работу ў бяднацка-серадняцкіх масах адміністраваньнем і каманданьнем.

Пасьпяховасьць далейшага перамога прасоўваньня на шляху сацыялізму і ліквідацыі кляс у нашай краіне патрабуе непрымірымай барацьбы з розным рознавіднасьцямі апартунізму і ў асаблівасьці з правым апартунізмам, які і па далёй застаецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, бязьлітасная барацьба в клясавым ворагам і ліквідацыі апошніх рэштак капіталістаў у нашай краіне. Па гэтым шляху ідзе наша партыя, паставіўшая перад сабой рэальную гістарычную задачу — замяніць у асноўным калектывізацыю СССР да канца пяцігодкі, дадаць і перагнаць ужо ў гэтым дзесяцігодзьдзі перадавыя капіталістычныя краіны.

Ю. БОРНОЗІН.

„Антыкамуністычны дэкрэт павінен быць зьнішчаны і ён будзе зьнішчаны"

Дэкларацыя ЦК нямецкай кампартыі

БЭРЛІН, 31. ЦК нямецкай кампартыі друкуе сёньня ў «Рота Фане» дэкларацыю аб дэкрэце ўраду Брюнінга. У дэкларацыі гаворыцца: «ЦК нямецкай кампартыі заяўляе перад тварам рабочае клясы і ўсіх пластоў працоўнага і беднага сялянства, што дэкрэт ураду і інбэнбурга Брюнінга, выданы на прапанове Зэвэрынга (прускі міністар унутраных спраў, — сацыял-дэмакрат) і підпэрэў сацыял-дэмакратыі прадстаўляе фашысцкае наступленьне на рэшткі свабоды і правоў народу. Гэты дэкрэт, які ставіць сабе

КАТЫ І ДУШЫЦЕЛІ

нацыянальна-вызваленчага руху працоўных мас Заходняй Беларусі

Па загаду і за грошы польскага фашызму беларускія нацыянал-фашысты разгортваюць сваю пагромную праграму

Па паслугах акупантаў!

ЗРОШЧВАНЬНЕ БЕЛАРУСКАГА І ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ

Апошнія студзеньскія пастановы Цэнтральнага Камітэту кампартыі Заходняй Беларусі падкрэсліваюць, што на Заходняй Беларусі адбываецца працэс змяшанага руху пад кіраўніцтвам кампартыі і ўмацаваньня ў ім гегемоніі пралетарыяту і паралельна з ім—працэс узмацненьня саюзу беларускай і польскай буржуазіі і далейшае зрошчваньне беларускага і польскага фашызму пад кіраўніцтвам фашысцкага ўраду.

У зьезд кампартыі Польшчы ў рэвалюцыі на нацыянальныя пытаньні адзначыў, што польская буржуазія імкнецца цесна зьвязаць з сабою буржуазію прыгнечаных народаў і выступаць у якасьці кіраўніка актыўнай барацьбы супроць рэвалюцыйнага руху працоўных мас як усёй Польшчы, так і Заходняй Беларусі і Украіны. Агульны хлеб, на якой адбываецца зрошчваньне польскай і беларускай і украінскай буржуазіі, зьвяжыцца адзіныя клясавыя інтарэсы і адзіныя клясавыя мэты. Апрача барацьбы супроць рэвалюцыйнага руху рабочых і сялян прыгнечаных народаў, і польскую і беларускую буржуазію аднае адзінства барацьбы супроць Савецкага Саюзу. Адзначаючы гэты працэс зрошчваньня польскага фашызму і беларускага і украінскага нацыянал-фашызму, У зьезд КПП указаў на значную актывізацыю [illegible] прыгнечаных народаў. Гэта актывізацыя ідзе на лініі узмацненьня барацьбы супроць нацыянальна-вызваленчага руху, узмацненьня антысавецкай актыўнасьці і ажыўленьня розных выдзелак і кошмахтаў з прадстаўнікамі польскай акупацыі. Відэспрэчна, меў рацыю V зьезд КПП, калі падкрэсьліў, што адным з моментаў, спрыяючых абвастрэньню барацьбы беларускай і польскай буржуазіі супроць СССР і зрошчваньню іх з польскім фашызмам зьяўляецца тыя працэсы, якія адбываюцца ўнутры Савецкага Саюзу, у прыватнасьці — унутры БССР і УССР. «Уяўленьне таго, што украінізацыя і беларусізацыя — гэта не «маневр», як заяўляе буржуазная прэса, уяўленьне таго, што пралетарыят будзе ў Савецкай Украіне і Савецкай Беларусі новую украінскую і беларускую культуру, нацыянальную па форме, сацыялістычную па зьмесьце, прымушае украінскую і беларускую буржуазію з яшчэ большай упартасьцю выступаць супроць савецкіх рэспублік. Заходня-украінская і заходня-беларуская буржуазія таксама добра разумее, якую вялікую небясьпеку складае для яе і калектывізацыя. Таму ва ўсёй нацыяналістычнай украінскай і беларускай прэсе праводзіцца шалёная кампанія хлусьні і паклёпаў, накіраваная супроць будаўніцтва сацыялізму» (з [illegible] У зьезду КПП).

«СУПРОЦЬ БССР! СУПРОЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ НА ЗБ»

Зусім відавочна, што такія гістарычныя працэсы, як ліквідацыя кулацтва як класы, знаходзяць сваё адлюстраваньне і на падзеях, якія адбываюцца на тым баку кардону. Гэта адлюстраваньне выяўляецца ў тым, што пачынаецца і абвастраецца клясавая дыфэрэнцыяцыя ўнутры заходня-беларускай вёскі. Гэта выяўляецца і ў тым, што заходня-беларуская буржуазія і яе палітычныя партыі і групоўкі, усё цясьней зрастаючыся з пануючай польскай буржуазіяй, завастраюць адначасова сваю агрэсыўнасьць да Савецкай Беларусі і нацыянальна-вызваленчага руху заходня-беларускіх працоўных мас. Ясна таксама, што банкрутства ўсякіх надзей беларускіх нацыяналістаў на буржуазна-нацыяналістычнае перараджэньне БССР, банкрутства спроб узяць у свае рукі справу нацыянальна-культурнага будаўніцтва з тым, каб весьці яго на райках контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, банкрутства зямельна-хутарской палітыкі, якая прабавала ўмацаваць пласт беларускага кулацтва—яшчэ больш абвастрае гэтыя клясавыя супярэчнасьці і яшчэ больш і мацней замацоўвае салідарнасьць і сумесныя дзеяньні паміж беларускай і польскай буржуазіяй.

ІГРА У АДКРЫТУЮ

Палітычныя групоўкі заходня-беларускай буржуазіі яшчэ да нядаўнага часу прабавалі сваё актыўнае супрацоўніцтва з польскай буржуазіяй па ўсіх пытаньнях унутранай і зьнешняй палітыкі ўзмоцнена ўтойваць пад дымавой заслонай радыкальных і крайня-«левых» фраз. Яшчэ зусім нядаўна так званыя «незалежніцкія» лёзунгі ня выходзілі з вуснаў беларускіх нацыянал-фашыстаў і са старонак іх прэсы. Яшчэ зусім нядаўна Луцкевічы, Астроўскія і да іх палобныя сарамліва замоўчалі наяўнасьць поўнага кантакту, які на справе існаваў і існуе паміж імі і акупантамі.

У сучасны момант, усе яшчэ карыстаючыся «левай» фразай для падману мас, беларускія буржуазна-фашысцкія партыі і групы, і перш за ўсё іх вядучая група — група Луцкевіча-Астроўскага, не прабуюць нават утойваць ужо факту свайго поўнага зрошчваньня з польскімі акупантамі. Гэты момант зьяўляецца по малаважным з пункту гледжаньня яго палітычнай значнасьці. Ён зьяўляецца тыповым для ўсёй сучаснай сітуацыі, якая характэрна крайнім абвастрэньнем агрэсыўнасьці [illegible] і пярыялізму ў адносінах да СССР і ліхаманкавым заканчэньнем падрыхтоўкі да антысавецкай інтэрвэнцыі. Блізкасьць вайны, падрыхтоўка да гэтай вайны ня толькі з боку польскай буржуазіі, але і з боку заходня-беларускай і заходня-украінскай буржуазіі прымушае і тую і другую частку адзінага антысавецкага лягеру рабіць у сьпешным парадку цэлы рад палітычных крокаў, якія падрыхтоўваюць неабходную глебу для інтэрвэнцыі. Гэтымі крокамі зьяўляецца адкрытае дэкляраваньне зьліжэньня паміж польскай буржуазіяй і буржуазіяй прыгнечаных народаў. Гэтымі крокамі зьяўляецца надзвычайная актывізацыя фашысцкага ўраду ў галіне сваёй нацыянальнай палітыкі. Гэтымі крокамі зьяўляецца новае завастрэньне «федэральных» лёзунгаў польскага імпэрыялізму, лёзунгаў вайны супроць Савецкай Украіны і Савецкай Беларусі. Перамовы паміж пілсудчыкамі і заходнім украінскімі нацыянал-фашыстамі, аб якіх паведамляла ўся наша прэса, перамовы, якія адбываюцца на сьвежых руінах украінскіх школ, каапэратываў, народных дамоў, зруйнаваных і зрабаваных акупантамі, носяць на сабе зусім лўны ваенны і антысавецкі характар. Артыкул Галуўкі, зьмешчаны на днях у афіцыёзе Пілсудзкага, зусім выразна заяўляе, што супасьцю гэтых перамоў зьяўляецца неабходнасьць умацаваньня Польшчы, як вялікай дзяржавы, неабходнасьць прызнаньня, што Украіна зьяўляецца «інтэгральнай часткай Польшчы».

Амаль адначасова з гэтымі падзеямі ў галіне нацыянальнай палітыкі польскага фашызму на Заходняй Украіне адбываюцца надзвычайна цікавыя падзеі і на лініі палітыкі фашызму на Заходняй Беларусі.

ЖЭЛІГОЎСКІ, КІРЦІКЛІС І АСТРОЎСКІ «ЗА ШКЛЯНКАЙ ЧОРНАЙ КАВЫ»

На днях уся польская прэса паведамляла аб тым, што ў так званым «Клюбе сполечным» у Вільні за шклянкай «чорнай кавы» адбыўся сход, прысьвечаны пытаньням «польска-беларускіх адносін». Што гэта парада зьяўляецца не малаважнай з пункту гледжаньня палітычнага, гаворыць ужо яе склад. Там прысутнічаў ня толькі рад журналістаў, але і афіцыйныя прадстаўнікі польскага ўраду, а іменна — віленскі ваявода Кірцікліс, вядомы польскі генэрал Жэлігоўскі, школьны інспэктар Віленскага ваяводства Станевіч і г. д. На гэтым сходзе выступіў з дакладам Астроўскі—гэты вядомы нацыянал-жандар і правакатар, былы дзяйнікінскі афіцэр і супрацоўнік белагвардзейскай охранкі, а пазьней актыўны супрацоўнік віленскай дэфэнзывы, актыўны ўдзельнік шматлікіх арыштаў беларускіх дзеячоў нацыянальна-вызваленчага руху. Кампанія, як мы бачым, даволі падабраная!

Гэты сход быў прысьвечаны, як паведамляе прэса, праграме «беларуска-польскіх адносін», г. зн. праграме цеснага супрацоўніцтва беларускай буржуазіі з акупантамі і распрацоўцы плянаў далейшых паводзін.

«ПРАГРАМА» НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНАЙ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫІ

Што прадстаўляе з сябе гэта праграма, выкладзеная Астроўскім на азначаным сходзе? Нават з няпоўнага апублікаваньня яго дакладу зусім акрэсьлена выступаюць наступныя моманты: 1) ясныя прызнаньні поўнага зрошчваньня беларускага нацыянал-фашызму з польскай акупацыяй, 2) яўная актывізацыя беларускіх фашысцкіх сіл у падрыхтоўцы вайны супроць БССР і 3) ясныя і зусім нядвухсэнсовыя прапановы з боку нацыянал-фашыстаў сваіх паслуг, за вельмі мінімальную плату, у барацьбе супроць нацыянальна-вызваленчага руху, у барацьбе за правядзеньне ў жыцьцё акупацыйнай, імкнеціцкай, імпэрыялістычнай палітыкі польскіх акупантаў на Заходняй Беларусі.

Дакład Астроўскага мае адначасова і тую цікавасьць, што, выкладаючы праграму свайго супрацоўніцтва з акупантамі, беларускі нацыянал-фашыст вусінамі аднаго са сваіх прадстаўнікоў адкрыта малюе ўсю гісторыю беларускага нацыяналізму, як гісторыю актыўнай барацьбы супроць беларускага народу, як гісторыю актыўнага супрацоўніцтва з польскім імпэрыялізмам. Перш, чым перайсьці да сёньняшніх дзён, Астроўскі, відавочна для большага перакананьня, пацьвярджае, што яшчэ з давасьніх часоў беларускія нацыяналісты ў сваёй палітыцы выходзілі з неабходнасьці супрацоўніцтва з польскай буржуазіяй і яе сацыял-рэфармісцкімі і нацыяналістычнымі партыямі. Указваючы на ролю «беларускай сацыялістычнай Грамады», Астроўскі падкрэсьлівае, што яна «зняла сваю барацьбу» руку ў руку з «польскай сацыялістычнай партыяй» і што іх адносіны «былі самымі найлепшымі».

ПІЛСУДЗКІ — «БЕЛАРУСКІМ ПРЭЗЫДЭНТАМ»

Астроўскі ўзмоцненна прабуе даказаць сваім гаспадарам, што беларуская контр-рэвалюцыя ў час рэвалюцыі і пасьля яе, г. зн. у годы грамадзянскай вайны і, у прыватнасьці ў годы вайны савецкіх рабочых і сялян супроць польскіх імпэрыялістаў, была заўсёды на баку апошніх.

«Пасьля захопу Менску польскім войскам, беларусы хочуць абрацьмаршала Пілсудзкага прэзыдэнтам. Польшча спачатку рэагавала на гэта спачувальна і адносіны паміж палякамі і беларусамі былі зусім нармальныя».

Астроўскі ветліва дапаўняе гісторыю контр-рэвалюцыйных «гэройскіх учынкаў» беларускага нацыяналізму. Акажацца, што беларускія нацыяналісты на толькі на каленях сустракалі ў 1920 годзе у Менску Пілсудзкага, але прапанавалі абрацьвіцца яго прэзыдэнтам, відавочна, як «сапраўднага прадстаўніка беларускага народу».

ЗДРАДА, ЗДРАДА, ЗДРАДА...

Далей Астроўскі выкрывае пазыцыі беларускай контр-рэвалюцыі ў час імпэрыялістычнай авантуры генэрала Жэлігоўскага ў 1921 г.

«Беларускія антымісты адносіліся спачувальна да акцыі генэрала Жэлігоўскага і ў сувязі з гэтай акцыяй узьнікла навет канцэпцыя стварэньня Заходняй Беларусі са сталіцай у Вільні, але гэтая канцэпцыя правалілася і была прынята другая канцэпцыя — Сярэдняй Літвы».

І хоць, як адзначае і прызнае Астроўскі, у пэрыяд пасьля акупацыі Вільні і гэтых чарговых паслуг, якія аказваюць Пілсудзкаму беларускія нацыяналісты, польскі ўрад павёў палітыку зруйнаваньня беларускіх школ і палітыку разгрому беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, нацыяналістычная контр-рэвалюцыя ўсё яшчэ шукае усіх шляхоў для супрацоўніцтва з польскім урадам. Астроўскі гаворыць:

«І ў далейшым беларусы выказваюць гатоўнасьць прыняць удзел у дзяржаўным жыцьці. Дзякуючы гапа сам беларускіх паслоў, у сойме быў выбран прэзыдэнтам Нарутовіч, а генэрал Сікорскі атрымаў вотум давер'я... У 1924 г. зьяўляецца [illegible] аб арганізацыі польска-беларускага таварыства, якое стаяла-бы на глебе цеснага супрацоўніцтва».

Але, неперакор усім агульным спробам беларускіх нацыяналістаў, клясавае змаганьне на Заходняй Беларусі абвастрэцца і расьце. Пал кіраўніцтвам пралетарыяту і яго кампартыі нацыянальна-вызваленчы рух, ачышчаючыся ад нацыянал-эгоідніцкіх элемэнтаў, завастрае сваё рэвалюцыйнае змаганьне супроць акупацыі. Пад кіраўніцтвам кампартыі — на Заходняй Беларусі расьце магутны рух мас, які знаходзіць сваё выяўленьне ў стварэньні статысячнай Грамады. Як не прабавалі беларускія нацыяналісты ў асобе Луцкевіча і Астроўскага, пралазячы ў асяродак Грамады, захапіць яе ў свае нацыяналістычныя рукі, як ня імкнуліся яны ўплываць на лінію яе паводзін, Грамада бурна разьвівалася, як рэвалюцыйная арганізацыя, як арганізацыя непрымірымага змаганьня супроць акупацыі і супроць беларускага буржуазнага нацыяналізму. І, ўспамінаючы той пэрыяд, Астроўскі прызнае, што

«Грамада пад уплывам агітацыі сялянства на ўсход, у бок Савецкай Беларусі».

БЕЛАРУСКІЯ НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫСТЫ ПРАВОДЗЯЦЬ ПАЛІТЫКУ БЕЛАГА ТЭРОРУ

І зусім ясна, што, успамінаючы гэты пэрыяд, Астроўскі ўсімі сіламі стараецца даказаць сваім панам, што і тады бы і ўсл яго кампанія — стаялі на пазыцыях «польскай дзяржаўнасьці», што і тады яны імкнуліся толькі да таго, каб Грамада займалася «пазытыўнай творчай работай». І таму Астроўскі вітае палітыку крывавага пагрому Грамады, якая ішла не па нацыяналістычных шляхох, а па шляхох рэвалюцыйнай нацыянальна-вызваленчай барацьбы пад гегемоніяй пралетарыяту. І таму Астроўскі ў сваім дакладзе падкрэсьлівае, што разгром Грамады, завастрэньне белага тэрору акупантаў на Заходняй Беларусі, якое ідзе побач з поўнымі адачкамі беларускаму кулацтву і беларускай буржуазіі, зьяўляецца «пераломным моментам».

«З мая 1928 г. пачынаецца новы этап польска-буржуазных адносін. Хоць беларусы маюць яшчэ заўвагі ў адносінах да сучаснага ўраду, аднак, за час пасьля маёвых урадаў наступіў станоўчы пералом».

Разам з гэтым, супрацоўнік віленскай дэфэнзывы, спэц па «беларускіх пытаньнях», выкрывае сваю ролю і ролю ўсіх нацыянал-фашыстаў у справе арышту Тарашкевіча. З дакладу відаць, што беларускія нацыянал-фашысты зрабілі ўсё, каб дапамагчы акупантам схапіць Тарашкевіча і зноў пасадзіць яго ў турму, як аднаго з выдатнейшых кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага [illegible] прапановы [illegible] Беларусі.

«У РАМКАХ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЬЦІ»

Намаляваўшы тэту контр-рэвалюцыйную хроніку гісторыі беларускай контр-рэвалюцыі, даноўнішы яе новымі фактамі служэньня польскаму імпэрыялізму, Астроўскі фармулюе бягучыя праграмныя лёзунгі беларускай буржуазіі, дзе чаго зводзяцца яны? Дамо слова самому Астроўскаму.

«Прызнаючы добрыя імкненьні польскага ўраду да нармалізацыі польска-беларускіх адносін, дакладчык лічыць, аднак, неабходным устанаўленьне ўрадам праграмы сваіх паводзін. Гэта праграма пазытыўнай палітыкі грунтуецца на прызнаньні беларусаў, як роўнаправных грамадзян дзяржавы, БО БЕЛАРУСЫ ШУКАЮЦЬ ЗАДАВАЛЬНЕНЬНЯ СВАІХ ПАТРЭБ У РАМКАХ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЬЦІ».

Тут заключана ўся палітычная праграма беларускага нацыяна - фашызму. Тут ясна, дасканала і акрэсьлена сфармуляваны лёзунгі беларускай контр-рэвалюцыі. Мы бачым, як беларуская контр - рэвалюцыя адмаўляецца нават ад высоўваньня ня толькі лёзунгу «незалежнасьці», але і лёзунгу «аўтаноміі». Мы бачым, што ўсе патрабаваньні выхо даяць з адкрытага прызнаньня беларускімі нацыянал - фашыстамі, што «рамкі польскай дзяржаўнасьці» зьяўляюцца тымі рамкамі, у якіх беларускія нацыяналісты прапануюць свае паслугі польскім імпэрыялістам. Такім чынам, беларуская нацыяналістычная контр-рэвалюцыя, якая так многа крычыць аб сабе, як аб «адзіным прадстаўніку ідэі незалежнасьці», ня толькі з боязьню замоўчвае аб гэтых сваіх ілжывых, ашуканчых лёзунгаў, але АДКРЫТА прызнае і ўзаконьвае польскую акупацыю на землях Заходняй Беларусі, АДКРЫТА прызнае Заходнюю Беларусь, як «інтэгральную частку» імпэрыялістычнай Польшчы, як калёнію польскага імпэрыялізму.

АДНУ ШКОЛУ НА ПАВЕТ

І, калі Астроўскі пераходзіць да выказваньня сваіх канкрэтных - патрабаваньняў, яны таксама скромныя, яны таксама выходзяць з гэтага аснoўнага рашаючага моманту — «рамак польскай дзяржаўнасьці», г. зн. рамак бязьмежнага сацыяльнага і нацыянальнага ўціску польскай акупацыі. У гэтых сваіх канкрэтных «патрабаваньнях» беларуская нацыяналістычная контр - рэвалюцыя, ідучы на шляху поўнага зрошчваньня з польскай акупацыяй, зводзіць свае лёзунгі да самага мінімальнага мінімуму. Астроўскі гаворыць у сваім дакладзе:

«Пры сучасным кан'юнктуры немагчыма, вядома, марыць аб адкрыцьці усіх 500 беларускіх школ, але зараз беларускае грамадзтва здавольнілася б адкрыцьцём на аднэй 7-гадовай школе на павет, на аднэй 3-х клясной школе там, дзе імкнецца гэта гэтага насельніцтва і гэта адразу паслабіла-б пануючае абвостранае становішча».

Такім чынам, гэтыя «гэрої, выступаючы ў сьмешнай ролі «абаронцаў» быццам «прасьледуемай» у БССР беларускай культуры, абмяжоўваюцца просьбай адкрыць адну школу на павет. І гэтыя «абаронцы ўсяго беларускага» — задавальняюцца прапановай Галуўкі «увесьці ў агульных школах навучанье белмовы, але не адкрываць спэцыяльных беларускіх школ». Ці патрэбна яшчэ большае самавыкрыцьцё! Ці патрэбны яшчэ больш яскравыя доказы таго, як беларуская буржуазная контр - рэвалюцыя ў адзіным фронце з акупантамі выступае з [illegible] супроць нацыянальна - вызв[illegible] руху і [illegible] адзін з ваяўнічых атрадаў імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі! Ці патрэбны яшчэ больш важкія доказы для таго, каб даказаць, як беларускія нацыяналісты на абодных бакох мяжы ў сваіх праграмных патрабаваньнях ахвотна ўкладваюцца ў рамкі польскай дзяржаўнасьці, г. зн. у рамкі фашысцкай дзяржавы і выступаюць сьпяганосцамі пагромнай палітыкі ў адносінах да нацыянальна - вызваленчага руху, да беларускай школы, беларускай мовы на Зах. Беларусі!

РАЗАМ З РАДЗІВІЛАМІ, САПЕГАМІ І ЗАПАТОЦКІМІ

Побач з гэтымі «культурна - асьветнымі патрабаваньнямі», як пазывае іх Астроўскі, выступаецца і «гаспадарча-эканамічная» частка праграмы. Яна таксама цікава, яна таксама зьяўляецца адным з момантаў, выкрываючых сапраўдны твар беларускага нацыяналізму. Астроўскі гаворыць:

«Урад павінен акружыць Сольшай апекай нашу краіну і прадаставіць матар'яльную дапамогу ня толькі памешчыкам, але і сялянству, паскорыць намасацыю і зямельную рэформу. Традыцыя вялікага князьства не памарла і мы яшчэ многа разоў будзем вяртацца да яе»...

Тут зноў-такі з выразнай акрэсьленасьцю беларуская буржуазія ў асобе сваіх нацыянал - фашысцкіх прадстаўнікоў афіцыйна дэкларуе поўнае падтрыманьне ўсёй зямельнай і гаспадарчай палітыкі акупантаў, дэкларуе сваё поўнае падтрыманьне памешчыцкіх магнатаў, якія трымаюць у сваіх руках больш паловы ўсёй зямлі Зах. Беларусі. Успаміны аб «сялянстве» вьвязаны, зразумела, з кулацкай верхавінай вёскі, бо і камасацыя і парцэляваньне зямлі, як уся гаогул зямельная палітыка акупантаў, накіраваны да ўмацаваньня кулацкіх пластоў і вядуць да яшчэ большага зьбяднеьня і зруйнаваньня асноўных мільённых мас бядняцка - серадняцкага сялянства Зах. Беларусі. Такім чынам, і ў гэтай галіне беларускія нацыянал - фашысты выступаюць у якасьці абаронцаў памешчыцкага ярма Радзівілаў, Сапегаў, Запатоцкіх, з усіх сіл дапамагаючы польскім акупантам эксплёатаваць і прыгнечваць шырокія масы беларускага сялянства, дабіваючыся і сваёй долі ў гэтай эксплёатацыі.

НА ШЛЯХОХ ІНТЭРВЭНЦЫІ

Уся гэта праграма актыўнага супрацоўніцтва з польскім фашызмам, уся гэта праграма самага подлага здраліцтва шырокіх працоўных мас беларускага народу завяршаецца чарговым заклікам да польскіх імпэрыялістаў умяшацца ў справы БССР. Гаворачы аб мяркуемым у Менску працэсе беларускіх падпалаў, Астроўскі заўважае:

«Сумьняцца беларусаў з палякамі запанець у значнай ступені ад таго, як Польшча адносіцца да гэтага гістарычнага моманту. Калі яны шчыра і сумленна будзе[illegible] законныя патрабаваньні беларусаў, дык беларусы будуць пойдзьнымі ў адносінах да польскай дзяржавы»...

Тут, як і ва ўсіх цытаваных дакумантах беларускіх нацыянал - фашыстаў, мы бачым просты прызыў да інтэрвэнцыі і простыя прапановы сваіх паслуг у справе ўзброенай барацьбы супроць Савецкай Беларусі, супроць Савецкага Саюзу. Зразумела, сьмешна выходзіць, калі група нацыянал - фашыстаў, якая ня мае больш ніякіх сур'ёзных уплываў у масах (атрымала на апошніх выбарах у сойм толькі 10 тыс. галасоў па ўсёй Заходняй Беларусі) выступае ад імя «усяго беларускага народу». Але на гэтым сьмешным баку выступленьняў п. Астроўскага — вопытнага прыкатара і дэфэнзыўшчыка — мы спыняцца ня будзем. Важна, што ўся гэта зграя контр - рэвалюцыйных бандытў проста, АДКРЫТА выкрывае сябе, як актыўных прыхільнікаў інтэрвэнцыі, як актыўных удзельнікаў у справе не падрыхтоўкі.

ТЭРОР, АКУПАЦЫЯ, ВАЙНА

Па сутнасьці справы, уся гэта «праграма» беларускай контр - рэвалюцыі падпалкавана ваенным мэтам. І не выпадова, што па дакладу Астроўскага выступаў Кірцікліс — зусім афіцыйная асоба, генэрал Жэлігоўскі — прадстаўнік найбольш агрэсыўнай часткі пілсудчыкаўскай ваеншчыны і г. д. Газэты паведамляюць, што усе яны «закранаілі ў сваіх выступленьнях вельмі цікавыя пытаньні», замоўчваючы, аднак, зьмест гэтых выступленьняў. Зусім ясна, па якой лініі ішлі гэтыя выступленьні. Яны ішлі па лініі падрыхтоўкі глебы для ваенных авантур, яны ішлі па лініі ўмацаваньня саюзу польскай і беларускай буржуазіі, яны ішлі, нарэшце, па лініі далейшага завастрэньня цкаваньня БССР і далейшага ўзмацненьня тэрору ў адносінах да нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі.

КПЗБ НА ЧАЛЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ БАРАЦЬБЫ ПРАЦОЎНЫХ ЗБ.

Кампартыя Заходняй Беларусі, якая вядзе пасьпяховую барацьбу па выкрыцьці беларускага нацыянал - фашызму і нацыянал - шавінізму, перад шырокімі масамі Зах. Беларусі, скарыстоўвае гэтыя канкрэтныя факты новых выступленьняў нацфашыстаў для яшчэ большага разгортваньня клясавага змаганьня, завастраньня нацыянальна-вызваленчага руху мас супроць акупацыі і яе нацыяналістычных агентаў, супроць ваенных імпэрыялістычных плянаў у абарону БССР і СССР.

БУДЗЕМ НАПАГАТОВЕ!

Тут, у БССР, гэтыя новыя факты самавыкрываўчых выступленьняў беларускага нацыянал-фашызму павінны быць даведзены да шырокіх працоўных мас. Перад масамі трэба паказаць на гэтых новых фактах далейшую эвалюцыю беларускага буржуазнага нацыяналізму, як там, у Зах. Беларусі, так і тут, у БССР, у бок непасрэднага зрошчваньня з польскім імпэрыялізмам і непасрэднага падпарадкаваньня яго камандзе. Гэтыя выступленьні Астроўскіх і іншых былых балаховіцкіх «гэрояў» зьяўляюць лепшым палітычным камэнтарыем і дадаткам да ўсёй гісторыі контр - рэвалюцыйнай шкодніцкай дзейнасьці і беларускіх нацдэмаў. Вуснамі Астроўскага гаворыць ня толькі беларуская контр-рэвалюцыя Заходняй Беларусі. Яго вуснамі гаворыць і Ластоўскія. Некрашэвічы—усе гэтыя верныя служкі замежных імпэрыялістаў, усе гэтыя вопытныя здрадні, шпіёны і шкодні[illegible]

Белы тэрор шалее па ўсёй Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне

За Луцкам—Ліда, Кобрын

Кожны дзень даносіцца стогны рабочых і сялян, катаваных у засьценках фашысцкай Польшчы.

Фашысцкі ўрад Польшчы, якая перажывае цяжкі крызіс, бачыць адзіны выхад з гэтай сітуацыі ў перакладаньні ўсіх цяжараў крызісу на плечы працоўных і ў інтэрвэнцыі супроць СССР —у заваяваньні Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны. Фашыам, аднак, уяўляе сабе, што на шляху да ажыцьцяўленьня сваіх д'абальскіх плянаў стаіць узрастаючая рэвалюцыйная хваля , якая ўсё больш узмацняецца побач з паглыбленьнем крызісу, зьяўляючыся найбольш грозным ворагам фашызму. Таму шляхам крывавага тэрору і правакацыі польскі фашызм імкнецца задушыць рэвалюцыйны рух як у самой Польшчы, так і нацыянальна-вызваленчы рух у Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

Дэфэнзывы і турмы перапоўнены арыштаванымі рэвалюцыянэрамі. Дэфэнзывы абярнуліся ў сапраўдныя катоўні, перад якімі блядне сярэдня-вяковая інквізыцыя. Дэфэнзывы забясьпечаны навейшымі прыладамі для катаваньняў: электрычны ток, гумавыя палкі, мэтапёвыя абцугі для сьцісканьня цела, прышчэпваньне сіфілісу і г. д.

Тое, што рабілася нядаўна ў Луцку, Лідзе, Кобрыне, зьяўляецца толькі выразам тэй сыстэмы, якую ўжывае фашысцкі ўрад супроць рэвалюцыйных рабочых і сялян. У Луцку на працягу 7 тыдняў трымалі і катавалі каля 100 палітычных зьняволеных. Агідніямі садыстычнымі сродкамі згвалчаны 22 жанчыны. У Лідзе палова палітычных зьняволеных з прычыны катаваньняў звар'яцела. У Берасьцейскай турме пляжаць яшчэ кворыя таварышы, якіх да крыві зьбілі ў Кобрынскай дэфэнзыве. Крывавыя лазні, якія наладжвалі фашысты ў каэматах дэфэнзывы, пытараюцца ў большай ці меншай ступені ва ўсіх польскіх дэфэнзывах. Аб [illegible] пекле, якое мусяць перанесьці палітычныя зьняволеныя ў дэфэнзывах, сьведчыць лічба калек і цяжка хворых сярод [illegible], якія адсылаюцца ўжо ў турму, хаця [illegible] рад арыштаваных яны былі зусім адарваныя ад [illegible] ні людзьмі.

Становішча ў турмах пагаршаецца з кожным днём

Фашысцкая дыктатура крок за крокам уводзіць у турмах фашысцкі рэгляамант. З усіх турмаў беларанскай Польшчы атрымліваюцца весткі аб страшэнным тэроры, зьдзеках і катаваньнях. Ад усёй вялізарнай масы палітзьняволеных фашызм адбірае апошнія правы, якія былі здабыты шляхам упартай барацьбы на працягу гадоў і якімі яны карысталіся да гэтага часу.

Паводле гэтага фашысцкага рэгляманту палітзьняволеныя пераводзяцца на становішча крымінальных. У Горадзенскай турме фашысты адбіраюць ад палітзьняволеных бібліятэку, вольную прагулку, харчовую камуну. У часе апошняй галадоўкі ў сакавіку бягучага году два палітзьняволеных у гэтай турме былі замучаны фашысцкімі катамі. У Пінску і Берасьці палітзьняволеныя сядзяць у адзіночках. На Лукішках і ў Беластоку турэмная адміністрацыя стараецца з усіх сіл зламаць супраціўленьне палітзьняволеных і ўвесьці новы рэгляамант. У студзені бягучага году ў Горадзенскай турме, адміністрацыя разам з паліцыяй нападзіла пагром палітзьняволеных, якія на хацеці здавалі сваіх заяваньняў.

Амаль ва ўсіх турмах адбываюцца галадоўкі палітзьняволеных. За апошні час хвалі галадовак пракаціліся па Беластоцкай, Віленскай, Берасьцейскай, Кароноўскай і іншых турмах. У лютым быў вялікі бунт вязьняў у Несьвіскай турме. Ва ўсіх турмах фашысцкай Польшчы палітзьняволеныя не на жыцьцё, а на сьмерць змагаюцца супроць тэрору і новага фашысцкага рэгляманту. У турмах фашысцкай Польшчы адбываецца блазьнічная і ўпартая барацьба палітзьняволеных супроць крывавых катаў. Спочынецца адна галадоўка, пачынаецца другая. Яшчэ ніколі ня было такой крывавай, такой заўзятай барацьбы, якую вядуць зараз палітычныя зьняволеныя супроць новага фашысцкага рэгляманту. Нічога дзіўнага! Гэты рэгляамант адбірае ў палітзьняволеных усе правы, якія яны заваявалі шматгадовай барацьбой.

Крывавыя фашысцкія каты, акрамя ліквідацыі бібліятэк, ліквідуюць яшчэ камуны і такім спосабам хочуць кінуць сотні тысяч палітзьняволеных, якія ня могуць дастаць ад сваіх сем'яў харчоў, на галодную сьмерць. Адбіраецца сваёбодная прагулка, абмяжоўваецца норма харчоў, якую можна паслаць з волі ў турму, скасоўваюць прадстаўніцтвы палітзьняволеных, зьдзекуюцца з іх сам'яў.

Каб зламаць адзінства камун палітзьняволеных, фашысты стараюцца пры дапамозе тэрору прымусіць сем'і палітзьняволеных, каб яны пісалі лісты да сваіх сыноў і братоў з просьбай выступаць з камун і не далучацца да галадовак.

Становішча жанчын па Лукішках (Вільня) распачлівае. Наглядчыцы вядуць сабе груба. У Берасьці і Беластоку палітзьняволеныя далі пераможны адпор атакам фашыстаў на іх правы, на жыцьцё і здароўе, але даходзяць новыя трывожныя весткі аб новых атаках фашысцкіх катаў на палітзьняволеных у Берасьці і Беластоку. Камуны гэтых турмаў рыхтуюцца зноў да барацьбы.

Вось, у якіх умовах жывуць палонныкі капіталу, якія аддаюць сваё жыцьцё і здароўе за рабочую справу.

Калі да гэтага дадаць тыя сапсёныя харчовыя ўмовы—турэмная страва складаецца з кавалка хлеба, вельмі часта сырога і тухлага, якога хапае толькі на адно сьнеданьне, літра супу з гнілой капусты, або чарвівай фасолі, страшэнны тэрор, бязупынная правакацыя [illegible] ай адміністрацыяй галадовак, [illegible] кім чынам трымаць палітзьняволе[illegible] у напружанасьці, — дык маляўнак [illegible] дасной распраўы фашысцкіх катаў над рэвалюцыянэрамі паўстае перад намі [illegible] ўсёй сваёй велічыні. Пахад фашызму за фізычнае зьнішчэньне лепшых прадстаўнікоў рабочай клясы і працоўнага сялянства адбываецца разгорнутым фронтам.

Працоўныя масы ня толькі БССР, але ўсяго сьвету, павінны ўзьняць свой рашучы голас пратэсту і выступіць на абарону палонынікаў капіталу.

Мары, мары...

«СУЧАСНАЯ ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЯ ГРАНІЦА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА НЕДАРЭЧНАСЬЦЮ, БО ЯНА ПАКІНУЛА НА ДРУГІМ БАКУ МЯЖЫ ПАД УЛАДАЙ САВЕТАЎ ЧЫСТА-ПОЛЬСКІЯ ЗЕМЛІ, ШТО МЕНСК ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЧЫСТА-ПОЛЬСКІМ ГОРАДАМ» («КУР'ЕР ЦОДЗЕННЫ»).

СЕНЬНЯ—ПЕРШЫ ДЗЕНЬ МЕСЯЧНІКА ПАХОДУ ЗА ТЭХНІКУ

ТЭХНІЧНУЮ ЗБРОЮ--КОЖНАМУ РАБОЧАМУ

(Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ па пытаньні аб аўладаньні тэхнікай)

Гіганцкія посьпехі рабочае клясы ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і выкананьня пяцігадовага пляну за чатыры гады з вычарпальнай паўнатой сьведчаць аб выключнай правільнасьці генэральнай лініі партыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, у пабудове сацыялізму ў нашай краіне.

Разам з гэтым асноўная задача, пастаўленая партыяй перад рабочай клясай, «дагнаць і перагнаць» капіталістычныя краіны німысьліма без аўладаньня найшырэйшымі масамі рабочае клясы тэхнікай, без паходу ўсіх масавых арганізацый рабочай клясы за тэхніку.

Шкодніцтва (прампартыя, меншавіцкае контр-рэвалюцыйнае бюро і г. д.) ясна пераканалі рабочую клясу, што пытаньне ўладаньня тэхнікай становіцца адным з актуальнейшых пытаньняў, да

УКАРАНЕНЬНЕМ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ

ЗАМАЦУЕМ КАЛГАСЫ

Сьледуйце прыкладу калгасу „Камінтэрн“, які прыступіў да ажыцьцяўленьня пастаноў VI зьезду саветаў

Арганізуючы сустрэчныя ў калгасах, пакрыем усю свабодную плошчу калектыўнымі пасевамі, дамо адпор апартуністам, якія імкнуцца скарачаць пляны

Зьдзельшчына перамагае

У ВЫНІКУ ПЕРАХОДУ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ Ў КАЛГАСЕ «КАМІНТЭРН» ПАДРЫХТОЎЧАЯ РАБОТА ДА ВЯСНЫ ПАЙШЛА ПАДВОЙНЫМІ ТЭМПАМІ ВЫПРАЦАВАЎШЫ НОРМЫ ПРАЦЫ І РАЗВІЎШЫ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ВРЫГАДЫ. У ГЭТЫМ КАЛГАСЕ ПАСТАНАВІЛІ ДАЦЬ УСІМ ВРЫГАДАМ ЗАДАНЬНІ НА ТЫДЗЕНЬ, КАБ НА ПРАКТЫЦЫ 7-ДЗЕННАЙ РАБОТЫ ПАГЛЯДЗЕЦЬ, ЯКІЯ ПЕРАВАГІ ДАЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА ПЕРАД ПАДЗЕННІЧНАЙ. РЭЗУЛЬТАТЫ АТРЫМАЛІСЯ ТАКІЯ: УСЕ ВРЫГАДЫ ПЕРАВЫКАНАЛІ СВАЕ ЗАДАНЬНІ, ЯКІЯ БЫЛІ ДАВОЛІ ВЯЛІКІМІ. НАПРЫКЛАД, ВРЫГАДА З 7-МІ ЧАЛАВЕК ПА ПЕРАВОЗЦЫ МІНЭРАЛЬНЫХ УГНАЕНЬНЯЎ ПАВІННА БЫЛА ПЕРАВЕЗЬЦІ СА СТАНЦЫІ Ў КАЛГАС (18 КІЛІМЭТРАЎ) НА ПРАЦЯГУ 7 ДЗЁН 2.000 ПУДОЎ УГНАЕНЬНЯЎ. БРЫГАДА НА ДЗЕНЬ РАНЕЙ ТЭРМІНУ СПРАВІЛАСЯ З ГЭТЫМ ЗАДАНЬНЕМ І СЕМЫ ДЗЕНЬ ПРЫСЬВЯЦІЛА ПЕРАВОЗЦЫ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ.

КАЛГАС ЗАВЕЎ ЧЫРВОНУЮ І ЧОРНУЮ ДОШКІ. ПА СКАНЧЭНЬНІ СЯМІДЗЕНЬНІКА ЧЫРВОНЫЯ ДОШКІ АКАЗАЛІСЯ ЗАПОЎНЕНЫМІ, А ЧОРНЫЯ — ЧЫСТЫМІ. ТОЛЬКІ НА ЧОРНЫЯ ДОШКІ АСОБНЫХ БРЫГАД БЫЛІ ЗАНЕСЕНЫ ПРОЗЬВІШЧЫ НЕКАТОРЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ. САМІ БРЫГАДЫ ВЫЯЎЛЯЛІ АСОБНЫХ ГУЛТАЕЎ, ЯКІЯ НЕ ХАЦЕЛІ ДОБРАСУМЛЕННА ПРАЦАВАЦЬ, І ЗАНОСІЛІ ІХ ПРОЗЬВІШЧЫ НА БРЫГАДНЫЯ ЧОРНЫЯ ДОШКІ.

С—І.

Вучэцеся ў камуны „Праца“

ЕЛЬСК.

Камуна «Праца»—адна з першых па раёне, якая падрыхтавалася ўсебакова да выхаду ў поле. Гэтага камуна дасягнула дзякуючы правільнай арганізацыі працы.

У мэтах дасканалай арганізацыі працы камуна арганізавала яшчэ ў студзені месяцы 5 брыгад, якія ўвесь час займаліся падрыхтоўкай да веснавой сяўбы. Былі арганізаваны брыгады: па насеньні, па жывёле, на вывазцы лесу і угнаеньняў, па рамонце с.-г. інвэнтару і брыгада па арганізацыі працы. Брыгады заключылі паміж сабою ўмовы па сацыяборніцтва і ўдарны ўзяліся за работу.

На вытворчай нарадзе брыгад, якая адбылася ў першых лічбах сакавіка, былі падведзены вынікі праробленай працы.

Рамонтная брыгада да 15 лютага скончыла рамонт інвэнтару. Брыгада па вывазцы лесу выканала поўнасцю свае заданьні: вывезла 150 кубаметраў лесу і ўсе вызначаныя нормы па ўгнаеньнях. Брыгада па ачыстцы насеньня ачысьціла ўсё насеньне, якое мелася. Брыгада па доглядзе рабочай жывёлы ўзмоцнена падгарміравае 25 коняй і забранізвала 70 цэнт. сена і необходную колькасьць аўса на час сяўбы; брыгада па арганізацыі працы склала план арганізацыі працы ў часе сяўбы на аснове норм выпрацоўкі, якія ўзяты з практыкі працы камуны. Нормы вызначаны, раўняючыся да выпрацоўкі ўдарнікаў камуны. Напрыклад, ворыва на пару коняй у адным плузе ўзята 0,75 гэкт. супроць 0,5 гэкт., касьба сена—2 касцы на 1 гэктар, а ня 3, як было раней.

Выяўлены і прарывы ў працы. Не хапае насеньня кармавых культур і будзе недахват грубых кармоў. На вытворчай нарадзе пастанавілі: брыгадзе па насеньні прыняць усе захады па набыцьцю насеньня з райкаапсаюзу, а ў адносінах да корму—зараз-жа ўзяцца за загатоўку сечкі з саломы, якая павінна будзе ў часе сяўбы замяняць сена.

Бачачы работу і жыцьцё камуны, батракі, беднякі і середнякі вакольных вёсак яясуць штодзенна заявы аб прыняцьці іх у камуну. За апошнюю дэкаду ў камуну ўлілося 27 гаспадарак.

Добрая падрыхтоўка камуны «Праца» да веснавой сяўбы зьяўляецца вынікам ударнай работы камуны, укараненьня зьдзельшчыны, аплаты працы па яе колькасьці і якасьці.

Н.

Ельскі райкалгассаюз цягнецца ў хвасьце ініцыятывы калгасаў

ЕЛЬСК.

Да гэтага часу ў калгасах Ельскага раёну нічога ня робіцца па ўкараненьні зьдзельшчыны. Отары спосаб дзяльбы па едаком перашкаджае разгортваньню ўдарніцтва і ўзьняцьцю прадукцыйнасьці працы ў калгасах. «Ядоцкі» прынцып перашкаджае ўзьняцьцю працоўнай дысцыпліны.

У калгасах Рамізоўскага сельсавету ёсьць культ, які ў канцы году атрымалі за агульны рахунак роўную частку прыбытку а тыці, хто па-ударному працаваў у калгасах. Такія праўленьні дэзарыентуюць лепшую частку калгасьнікаў і перашкаджаюць умацаваньню калгасаў.

Некаторыя калгасы імкнуцца ўвесьці зьдзельшчыну ў сваёй рабоце, але ня могуць гэтага зрабіць без дапамогі з боку райкалгассаюзу.

Ельскі райкалгассаюз ня ўжывае практычных крокаў, якіх-б забясьпечылі ўкараненьне зьдзельшчыны ў калгасах.

Разам з такімі ганебнымі прыкладамі ёсьць і дадатнія. Асобныя калгасы рабіцца на сваёй ініцыятыве арганізавалі сустрэчныя пляны да веснавой песяўнай кампаніі.

С.-г. арцель «Чырвоны трактар» павялічвае пляны яравых пасеваў па 10 проц., камуна «Праца»—па 15 проц., а.-т. арцель «Рэвалюцыя»—па 9 проц. У гэтых калгасах у асноўным скончана падрыхтоўка да веснавой сяўбы.

Між тым як зьдзельшчына, так і сустрэчныя пляны райкалгассаюзам недаацэньваюцца. Нічога ня робіцца, каб ініцыцыя сустрэчных плянаў была распаўсюджана па ўсім раёне.

П.



Падрыхтоўка парнікоў.

„БАЛЬШАВІК“ МОЦНА ТРЫМАЕ

пераходны сьцяг імя ЦСПСБ

Прамфінплян першага кварталу выканан па ўсіх паказальніках

Перамога „Бальшавіка“—вынік правільнай перабудовы партыйнай і прафсаюзнай работы, вынік актыўнасьці і энтузіязму рабочага калектыву, ахопленага сацыяборніцтвам і ўдарніцтвам, вынік правільнага гаспадарчага кіраўніцтва

Фабрыкі і заводы, якія канчаюць першы квартал з прарывамі, вучэцеся ад ударнікаў „Бальшавіка“!

Менскаму гаркому КП(б)Б, Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б і ЦО партыі—газэце „Зьвязда“

Рапарт парткалектыву КП(б)Б менскай чырвонасьцяжнай гарбарні „Бальшавік“

Перавыбарчая кампанія партыйных органаў будзе праходзіць у момант падведзеньня вынікаў выкананьня прамфінпляну за першы квартал і падрыхтоўкі да ўступленьня ў другі квартал трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Неабходнасьць забясьпечыць бальшавіцкія тэмпы для заваяваньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у бягучым годзе патрабуе мабілізацыі ўсёй творчай актыўнасьці рабочых мас вакол барацьбы за выкананьне і перавыкананьне заданьняў па прамфінпляне. На аснове датэрміноваага пасьпяховага скончэньня на нашым заводзе прамфінпляну за першы квартал як па колькасных, так і па якасных паказальніках, мы будзем у перавыбарчую кампанію праверыць дапейшую мабілізацыю рабочай масы на зьнішчэньня ўсіх недахопаў, якія ёсьць на заводзе (зьвязаваткасьць у ходзе выкананьня прамфінпляну паміж асобнымі пляцівкамі, прагулы па нягрунтоўных прычынах і інш.).

Без забясьпячэньня росту прадукцыйнасьці працы мы ня зможам выканаць задач трэцяга году пяцігодкі.

Для гэтага неабходна дабіцца поўнай загрузкі рабочага дня: неабходна дабіцца такіх расцэнак, якія стымулююць імкненьне рабочых да падняцьця сваёй кваліфікацыі; неабходна дабіцца ўвязкі павышэньня тэхнічных ведаў рабочых з пераводам іх у вышэйшы разрад.

Перавыбарчую кампанію мы ўвязалі з мабілізацыяй мас на павышэньне сваіх норм, на выпэўненьне сваіх сустрэчных норм выпрацоўкі, на ўстанаўленьне больш правільных расцэнак адпаведна кваліфікацыі рабочых, на аўладаньне тэхнікай.

У змаганьні за перамогу сацыялізму наша партыя патрабуе ад кожнага партыйца, каб ён на вытворчасьці служыў прыкладам для ўсіх ударнікаў сваёй брыгады.

Перавыбарчая кампанія павінна будзе выявіць ролю кожнага камуніста на вытворчасьці, наколькі вышэй у параўнаньні з беспартыйным кожны партыец выконвае сваю норму выпрацоўкі, наколькі меншы ў яго процант браку, наколькі лепш ён працуе над павышэньнем сваіх тэхнічных ведаў.

На аснове мабілізацыі мас на выкананьне генэральнай лініі партыі, на аснове прапаганды ленінскага разуменьня партыйнасьці, наша партарганізацыя ўцягнула за першы квартал 1931 году 36 рабочых-ударнікаў.

Перавыбарчая кампанія павінна будзе нам забясьпечыць шляхам паказаньня арганізуючай ролі нашага парткалектыву ўцягненьне ў партыю лепшых ударнікаў, здольных змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Перабудова партыйна-масавай работы, пераняцьце ўсёй работы ў партгрупу забясьпечыла ў нашым парткалектыве пасьпяховую барацьбу за мабілізацыю мас на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Перавыбарчая кампанія павінна будзе яшчэ больш замацаваць праведзеную перабудову партработы, яшчэ больш узмацніць ролю партгрупы і партарганізатараў у рабоце на прадпрыемстве.

На аснове правядзеньня ў жыцьцё ўсіх паказаных задач мы ў перавыбарчай кампаніі яшчэ больш загартуем усю партарганізацыю і найбольш сьвядомую частку беспартыйных рабочых на пасьлядоўнае правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, на бязьлітасную барацьбу супроць правага ўхілу—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў, супроць прымірэнцтва да ўсякіх ухілаў.

Па даручэньні агульнага сходу парткалектыву.

сакратар парткалектыву

С. ДЗЯЦІНА.

МЕНСКАЯ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАЯ ГАРБАРНЯ «БАЛЬШАВІК» 30 САКАВІКА ДАТЭРМІНОВА СКОНЧЫЛА ПРАГРАМУ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ: У КОЛЬКАСНЫМ ВЫРАЗЕ—НА 102,8 ПРОЦ., У ПЭННАСНЫМ—НА 100,5 ПРОЦ. САБЕКОШТ ЗА СТУДЗЕНЬ І ЛЮТЫ ЗНІЖАН НА 2,7 ПРОЦ., ЗАМЕСТ 2 ПРОЦ., ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ.

СТАРШЫНЯ ЗАЎКОМУ РЭУТОВІЧ.
ДЫРЭКТАР КІРШЭНБЛЮМ
САКРАТАР ПАРТКАЛЕКТЫВУ ДЗЯЦІНА.

* * *

КАРТОННАЯ ФАБРЫКА ІМЯ ВАРОЎСКАГА 28-29 САКАВІКА ПОЎНАСЬЦЮ СКОНЧЫЛА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ

* * *

МЕНСКАЯ ФАБРЫКА «КАМУНАРКА» ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЛА ПРАГРАМУ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ. НА 30 САКАВІКА ПРАГРАМА ВЫКАНАНА НА 115,2 ПРОЦ., ВЫХОДЗЯЧЫ З КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ. І НА 102,2 ПРОЦ., ВЫХОДЗЯЧЫ З ЛІЧБАЎ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ. БІСКВІТНЫ ЦЭХ СКОНЧЫЎ ПРАГРАМУ ЯШЧЭ 22 САКАВІКА. КАРАМЕЛЬНЫ ЦЭХ ПЕРАВЫКАНАЎ СУСТРЭЧНУЮ ПРАГРАМУ НА 0,8 ПРОЦ., МЯККА-ШАКАЛЯДНЫ НА 10 ПРОЦ.

* * *

УЧОРА НА МЕНСКІМ МАШЫНА-БУДАЎНІЧЫМ ЗАВОДЗЕ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА ВРЫГАДА ТАВ. ДРЫКА, ЛІКВІДАВАЎШЫ ЗНАЧНЫ ПРАРЫЎ ЗА СТУДЗЕНЬ І ЛЮТЫ, ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЛА ПРАГРАМУ ПА ВЫПУСКУ ЦЭНТРАВАЛЬНЫХ ВАРШТАТАЎ. ТАКСАМА ВЫКАНАЛА ПРАГРАМУ ВРЫГАДА ТАВ. ЯКУБОЎСКАГА ПА ВЫПУСКУ СЬВІДРАВАЛЬНЫХ ВАРШТАТАЎ. ВРЫГАДА ДА КАНЦА МЕСЯЦА ДАСЬЦЬ ЯШЧЭ ТРЫ ВАРШТАТЫ ЗВЫШ ПРАГРАМЫ. ПА КАЦЕЛЬНЫМ ЦЭХУ ВРЫГАДА ТАВ. ПЯТРОВІЧА СКОНЧЫЛА СВАЮ КВАРТАЛЬНУЮ ПРАГРАМУ 25 САКАВІКА, ВРЫГАДА ТАВ. ВЫСОЦКАГА — 27 САКАВІКА.

* * *

КАМСАМОЛЬСКІ АГРЭГАТ ПІДЖАЧНАГА ЦЭХУ ГОМЕЛЬСКАЙ ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ «КАМІНТЭРН» ДАТЭРМІНОВА СКОНЧЫЎ ПРАГРАМУ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ.

На гарбарні «Бальшавік» падлічваюць вынікі сацыяборніцтва

У прарывах вінават „трыкутнік“

На шклоўскай фабрыцы «Спартак» панае поўная безгаспадарчасьць. Маючы перабоі ў здавальненьні вугалем з верасьня месяца, заводкіраўніцтва нічога не зрабіла для своечасовага пераходу на мясцовы апал, і дровы ў належнай колькасьці своечасова ня былі загатоўлены. Топкі ня былі пераабсталяваны для апалу дрывамі. Таксама нічога ня было зроблена заводкіраўніцтвам па пытаньні аб пераводзе на тарфяны апал. Тарфяное балота, якое знаходзіцца за 5 кілометры ад фабрыкі і падрыхтавана для распрацоўкі, ня ўключана ў пляны Белторфу на 1931 г.

Догляд машын барбарскі. Рэгулярнай чысткі, змазкі машын, а таксама штодзеннага нагляду за чысьтатой і ўборкай памяшканьня не вядзецца. Сыр-рэц валяецца па дварэ і топчацца нагамі. Да ўнутрызаводзкага транспарту адносны злачынныя: вузкакалейка не ачышчана ад сьнегу, не агароджана ад заносаў, вынікам чаго зьявілася павялічэньне выдаткаў па гужавых перавозках.

Няма рашучай барацьбы з бракам і правільнай пастаноўкі работы па паляпшэньні якасьці прадукцыі. Пытаньнем рацыяналізацыі займаліся фармальна, рацыяналізатарскія пляны не даводзяцца да кожнага рабочага, не завострана ўвага на барацьбе за зьніжэньне сабекошту.

Адсутнічае ўлік спаборніцтва і ўдарніцтва. Штаты роўнамерна не размеркаваны. Пытаньне аб рабочым тыдні (пяцідзёўка ці сямідзёўка) не распрацавана. Штат канторы раздуты пры вельмі нізкай якасьці работнікаў. Работнікі, якія атрымалі спэцыяльную тэхнічную падрыхтоўку—па тэхнічным нармаваньні,—скарыстоўваюцца ў якасьці загадчыкаў клюбаў і г. д.

На пытаньне падрыхтоўкі кадраў не зварачаецца адпаведная увагі. Плян патрэбнасьці рабсілы на 1931 г. адсутнічае. Работа з вылучэнцамі не вядзецца. Завочнае навучаньне ў патрэбнай меры не выкарыстоўваецца. Упаўнаважаны па БРЫЗ'е ня вылучан, а за невыкананьне рабочых прапаноў заводкіраўніцтва аддана пад суд. Прэміяваньне ў належнай ступені не праводзіцца.

Абсталяваньне лябараторыі вельмі мізэрнае, а штат невыстарчальны і мала кваліфікаваны, і таму работа праводзіцца ня поўныя суткі, таму аналізы адстаюць ад тэмпаў вытворчасьці. Лябараторыя своечасова не сыгналізуе аб паторшаньні якасьці паперы і аб необходных зьменах у тэхналёгічных працэсах.

Прафарганізацыя фабрыкі «Спартак» яшчэ не павярнулася тварам да вытворчасьці. Шырокія рабочыя масы ня былі своечасова мабілізаваны на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Ва ўсёй працы наглядаецца хвасьцізм і стаўка на самацёк.

Да прэміяваньня рабочых прапаноў і выходзтва праўдзіцца фармальны падыход, які даводзіць да змазваньня самога значэньня прэміяваньня, як сродку разьвіцьця рабочай ініцыятывы. Выдаткаваньне фонду рабочага выканаходзтва рабілася невыстарчальна, а часамі і нязраўнальна. Процант з эфэктасьці ў фонд БРЫЗ'у не адлічаецца. Пытаньням абмену вопытам не аддана патрэбная ўвага.

Раённая газэта «Прамень камунізму» зварачае выстарчальную ўвагу на асьвятленьне жыцьця фабрыкі, але ня сочыць за своечасовым і правільным рэагаваньнем на заметкі, а заводкіраўніцтва зусім не знаходзіць патрэбным рэагаваць на рабкораўскія допісы. У газэце адсутнічае штодзенная барацьба за ажыцьцяўленьне тых задач, якія газэта высоўвае на сваіх старонках.

Прамфінпляны на 1929-30 г. і на ўлавны квартал былі зусім рэальныя. Такое становішча і з плянам на 1931 г. Пры зьнішчэньні ўсіх вышэй паказаных недахопаў, пры правільным кіраўніцтве партыйнай ячэйкі плян 1931 г. будзе выканан і перавыкананы.

Майсук, Міляйнеўскі Аук.

Без кіраўніка

Вось ужо 2 месяцы, як паводле пастановы райкому КП(б)В дырэктар заводу «Адраджэньне» (Хойнікі) перайшоў на работу ў райКК. Завод застаўся без кіраўніка. Вынікі ўжо ёсьць. За студзень і люты завод ня выканаў праграмы па выраб піламатар'ялаў на 22 проц. і па вырабе фрэзу—на 28 проц. Паркетны цэх замест 5-х зьмен працуе з напружанасьцю ледзь у адну зьмену.

Вельмі кепская справа з забясьпячэньнем заводу сырцом. Завод хоць і мае свой гужавы транспарт, аднак, коні стаяць з-за недахвату корму.

Адпаведныя органы павінны заацікавіцца становішчам нашага заводу.

ВОКА.

Выкананьне прамфінпляну ў сакрэце

15-га сакавіка завод «Камінтэрн» (Н.-Барысаў) пачаў вытворчыя манэўры. Аднак, заводкіраўніцтва да вытворчых манэўраў зусім не падрыхтавалася. Ужо па другі дзень манэўраў шэльмашына прастаяла 18 гадзін. На трэці дзень фанэрны цэх прастаяў 8 гадзін, бо папсаваліся прэсы.

За 5 дзён вытворчых манэўраў праграма выканана па лесапільнай вытворчасьці на 89,34, па фанэрнай — на 68,3 проц., па унітазнай — на 84,05. Між іншым, дырэктар заводу т. Шульгін чамусьці забараніў канторы выдаваць весткі аб выкананьні прамфінпляну.

Барысаўскі.

Прастоі з-за безгаспадарчасьці

На заводзе «Змычка» (Капаткевічы) за апошні час наглядаецца шмат фактаў безгаспадарчасьці. Вузкакалейка для падвозкі лесаматар'ялаў закідана абрэзкамі. З гэтай прычыны ёсьць вялікія прастоі варштатаў і барабанаў, бо падвозка лесаматар'ялаў не пасьпявае.

Мяшкі з вугалем валяюцца на вольным паветры і расьсыпаюцца. Бачкарка раскідана і ня зьвязваецца. Сяляне, якія прывозяць бачкарку, чакаюць на некалькі гадзін, пакуль зьбіраюць раськіданую бачкарку. Усе гэтыя факты вельмі адмоўна адбіваюцца на выкананьні прамфінпляну.

Рабочая грамадзкасьць заводу павінна прыцягнуць адміністрацыю да адказнасьці.

ВЕДАЮЧЫ.

Колькі процантаў на бязьдзейнасьць?

Фанэрная фабрыка «Чырвоны Кастрычнік» (Мазыр) за студзень выканала праграму на 93,6 проц., за люты — на 82,3 проц. Кіраўніцтва фабрыкі імкнецца даказаць, што ў гэтым вялізарным прарыве вінаваты выключна абэктыўныя прычыны: прастой лёкамабіля, паломка машын і варштатаў. Аднак, гэтыя прычыны могуць служыць толькі частковым апраўданьнем у прарыве. Значная частка віны за прарыў падае і на кепскае кіраўніцтва «трыкутніка». Ударніцтва і сапсяборніцтва разгорнута толькі па паперы. Работа сярод ударнікаў не вядзецца. Вытворчы сакратар фабкому за апошні час [illegible] не працуе. Фабком [illegible] не перабудаваў сваёй работы на аснове пастаноў XVI зьезду партыі і V пленуму УсеЦСПС. Культмасавая работа зусім слабая. На фабрыцы ёсьць пімат новых рабочых з вёскі. Аднак, сярод іх пілкай работы не праводзіцца.

Брыгадзір «Зьвязды».

ЯРГОЛІН.

Ударнікі—у рады партыі

На адкрытым партсходзе заводу „Бальшавік“

Учора на чырвонасьцяжнай гарбарні «Бальшавік» адбыўся адкрыты партыйны сход, у якім прынялі ўдзел камсамольская арганізацыя і каля 300 беспартыйных рабочых-ударнікаў.

З вялікім дакладам аб палітычных задачах і значэньні перавыбарчай кампаніі партарганаў выступіў сакратар менскага гаркому КП(б)Б т. Кавальчук. Пасьля спрачак зацьверджан плян правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі партарганізацыі на заводзе.

У мэтах абмену вопытам пастаноўкі партыйнай работы сход вылучыў брыгаду, якая азнаёміцца з пастаноўкай партыйнай работы на абутковай фабрыцы. Намечана вылучыць брыгады па абсьледваньні партыйнай работы ў падшэфных установах. Сход паслаў рапарт ЦК КП(б)Б, гаркому КП(б)Б і ЦО «Зьвязьдзе» аб ходзе падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі на заводзе.

На сходзе 20 лепшых ударнікаў з вялікім вытворчым стажам ад 5 да 26 год падалі заявы аб уступленьні ў партыю. У сваёй заяве ўдарнікі пішуць:

«Упэўніўшыся, што наша партыя вядзе адзіна правільную лінію, якая забясьпечвае рабочай клясе адну перамогу за другой у яе барацьбе за пабудову сацыялізму, мы лічым для сябе немагчымым далей заставацца беспартыйнымі і просім прыняць нас у члены партыі, каб у яе сталёвым радох змагацца супроць усіх труднасьцяй, што няўхільна ўзьнікаюць у ходзе сацыялістычнага будаўніцтва. Заклікаем усіх лепшых ударнікаў, якія яшчэ не знаходзяцца ў радох партыі, пасьледваць нашаму прыкладу.

Падрабязна аб сходзе будзе зьмешчана ў заўтрашнім нумары.

КУЛЬТПАЛІТАСЬВЕТНУЮ РАБОТУ

пераключыць на выкананьне задач генэральнай праверкі

Двухдэкаднік праверкі падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы—рашаючы момант у перабудове работы хат-чытапень, нардамоў, чырвоных куткоў тварам да задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі

Пераключыцца на выкананьне задач генэральнай праверкі

У справе пасьпяховага правядзеньня генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы, вялікую ролю пазінны адыграць культасьветныя ўстановы на вёсцы, у калгасе і саўгасе.

ХАТЫ-ЧЫТАЛЬНІ, НАРДАМЫ, ЧЫРВОНЫЯ КУТКІ СВАЮ РАБОТУ НА ЧАС ПРАВЕРКІ ПАВІННЫ ПАСТАВІЦЬ САПРАЎДЫ ПА-БАЛЬШОВУ.

Найлепшых вынікаў праверкі мы дабёмся толькі тады, калі да гэтай справы будуць прыцягнуты САМЫЯ ШЫРОКІЯ МАСЫ РАБОЧЫХ САЎГАСАЎ, МТС, КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ — БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ. У гэтых адносінах культасьветныя ўстановы павінны разгарнуць вялікую работу.

Хаты-чытальні чырвоныя куткі абязаны правесьці шырокую масава-растумачальную работу па пытаньнях працы і чарговых задачах веснавой сяўбы.

Праз цэлы рад масавых мерапрыемстваў неабходна найшырэй папулярызаваць адозву ЦК УсеКП(б) і СНК аб антратакцыі, адозву калгаснага зьезду пастановы VI-га зьезду саветаў аб калгасным будаўніцтве. І НЯ ТОЛЬКІ ПАПУЛЯРЫЗАВАЦЬ, АЛЕ НА СПРАВЕ ДАПАМАГАЦЬ ПАРТЫІ АРГАНІЗОЎВАЦЬ НОВЫ КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ, замацоўваць існуючыя калгасы.

У самай ЗРАЗУМЕЛАЙ і ПРОСТАЙ ФОРМЕ трэба растлумачыць кожнаму калгасьніку, кожнаму аднаасобніку — бедняку і серадняку палітычную важнасьць і ўсю неабходнасьць сваячасовага выкананьня УСІХ СУСТАЎНЫХ ЧАСТАК пасеўнага плану.

Праз дыяграмы і цэлы рад іншых наглядных дапаможнікаў, культ.-асьветныя ўстановы павінны давесьці неабходнасьць ня толькі поўнага выкананьня плянаў пашырэньня плошчы пад яравыя культуры, але іх перавыкананьне.

У часе праверкі неабходна наладзіць шырокую работу па кніганешае. Кніжкай аб веснавой сяўбе і калектывізацыі, аб спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі — жывёлагадоўлі і тэхнічных культурах трэба забясьпечыць кожнага рабочага саўгасу, кожнага калгасьніка і аднаасобніка.

У хатах-чытальнях, чырвоных куткох павінен быць арганізован паказ на канкрэтных фактах вопыту работы перадавых калгасаў у галіне арганізацыі працы, пераводу на зьдзельшчыну, у галіне ўмелай і добрай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Культасьветныя ўстановы ў часе праверкі НА СПРАВЕ павінны паказаць, ЯК ЯНЫ ЎМЕЮЦЬ выконваць баявыя заданьні партыі. З усёй рашучасьцю і да канца трэба выжываць з практыкі гэтых устаноў як голую культурку, так і элемэнты вузкага дзяляцтва.

ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ абавязаны ПА-САПРАЎДНАМУ ўзяцца за кіраўніцтва работай культасьветных устаноў. Зрабіць хату-чытальню сапраўдным домам культуры, ДЗЕЙСНЫМ ПАМОЧНІКАМ ПАРТЫІ ў справе мабілізацыі шырокіх працоўных мас для ажыцьцяўленьня чарговых баявых задач — ВОСЬ ЗАДАЧА КОЖНАЙ КАЛГАСНАЙ, САЎГАСНАЙ, КОЖНАЙ ВЯСКОВАЙ ЯЧЭЙКІ КП(б)Б.

2-хдэкаднік генэральнай праверкі пад рыхтоўкі да веснавой сяўбы будзе таксама праверкай таго, як культасьветныя ўстановы на справе змагаюцца за сацыялістычную перабудову вёскі. ГЭТЫ 2-ХДЭКАДНІК ПАВІНЕН ЗЬЯВІЦЦА АДНЫМ З РАШАЮЧЫХ МОМАНТАЎ ПЕРАБУДОВЫ ЎСЁЙ КУЛЬТПАЛІТАСЬВЕТНАЙ РАБОТЫ КАЛГАСУ, САЎГАСУ, ВЁСКІ ТВАРАМ ДА АКТУАЛЬНЕЙШЫХ ЗАДАЧ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Не павярнуліся тварам да бальшавіцкай вясны

ЛЕПЕЛЬ. Культурнае абслугоўваньне калгасаў раёну на сёньняшні дзень вельмі дрэннае. У большасьці няма чырвоных куткоў. А калі дзе-ні-дзе і ёсьць яны, дык адсутнічае ўсякае кіраўніцтва імі.

У розных гуртках і арганізацыі калгасьнікі ня ўцякуць. У абсалютнай большасьці калгасаў не выдаюцца насьценныя газэты. Лікпункты працоўнае кенска. Ёсьць прыклады, калі прызначаны ліквідатар сам зрывае заняткі («Чырвоны ўсход»).

З боку настаўніцтва і наогул культурных работнікаў вёскі назіраецца нядбайныя адносіны да культурна выхаваўчай справы ў калгасах Лепельшчыны.

Здавалася-б, што напярэдадні другой бальшавіцкай вясны работу трэба было разгарнуць ва ўсю шырыню, але гэтага няма. Калгасы не забясьпечаны адпаведнай літаратурай, справа грамадзкага харчаваньня не наладжана, пра арганізацыю дзіцячых ясьляй ніхто не клапоціцца.

З заўтрашняга дня пачынаецца генэральная праверка падрыхтаванасьці калгасаў БССР да бальшавіцкай сяўбы. Пачатак праверкі павінен пакласьці рашучы паварот у культурным абслугоўваньні калгасаў Лепельскага раёну.

Брыгада «Зьвязды» Мячук, Радзюк.

Няма кніжак аб пасеўнай кампаніі

ЛЯЗНА. Зусім зразумела, што ў пасьпяховым правядзеньні бальшавіцкай сяўбы вялізарную ролю адыгрывае адпаведная масавая кніжка. На вялікі жаль, у Лёзьненскім раёне хапае ёсьць і некалькі кнігарань, але ў дзень з ліхтаром ня знойдзеш патрэбнае літаратуры. Ёсьць толькі некалькі кніжак выданьня 1929 г.

Райпалітінспэктар спасылаецца на тое, што запатрабаваньні Беллазяржвыдавецтву пасланы даўным даўно, але БДВ чамусьці марудзіць.

Дрэнна і з падручнікамі для ліквпунктаў. У раёне атрымалы падручнікі толькі гэтымі днямі, калі прайшло ўжо больш паловы навучальнага году. Між тым на складах БДВ яны ляжалі з месяц.

Нельга зьніжаць значэньне кнігі ў падыходзячай сяўбе. Генэральная праверка павінна закрануць і гэты бок падрыхтоўкі. Папулярная кніжка для калгасьніка павінна заняць сваё пачэснае месца ў кожнай кнігарні, бібліятэцы і пакоўцы.

Культпалітасьветныя ўстановы нездавальняюча ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да бальшавіцкай сяўбы

Толькі што праведзеная ўсебеларуская нарада інспэктароў народнай і палітычнай асьветы дала магчымасьць падвесьці папярэднія вынікі ўдзелу культпалітасьветных устаноў у правядзеньні другой бальшавіцкай вясны.

Інфармацыі раённых інспэктароў і спрачкі па дакладу Наркамзему выявілі, што пераважная большасьць культпалітасьветных устаноў прымае зусім слабы ўдзел у падрыхтоўцы да сяўбы, а некаторая частка яшчэ нават і ня ўключылася ў правядзеньне гэтай работы.

Нарада канстатавала, што на мясцох ёсьць поўная недаацэнка вялізарнай ролі масавай культпалітасьветнай работы ў выкананьні задач другой бальшавіцкай вясны.

Неабходна дабіцца рашучага пералому ў адносінах партыйных і савецкіх арганізацый да культмасавай палітасьветнай работы.

Абвешчаны другі этап эстафэты мае спэцыяльны маршрут, які прадугледжвае практычныя мерапрыемствы грунтоўнага пашаноту ўсіх культмасавых і палітасьветных устаноў да задач правядзеньня бальшавіцкай вясны. Трэба поўнасьцю скарыстаць той час, які застаўся, для разгортваньня гэтай работы.

[illegible] ў сапраўдны [illegible] пасеўнай кампаніі [illegible] сацыялістычнаму сэктару [illegible] вёскі [illegible] мас [illegible] сацыялістычнага [illegible]

кадны тэрмін распрацаваць адзіны плян культпалітасьветнага абслугоўваньня пасеўкампаніі, мабілізацыі вакол задач і плянаў ня рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас. У бліжэйшую задачу ўваходзіць арганізацыя магутнага прыліву ў калгасы, правэрка падрыхтоўкі калгасаў, саўгасаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў да выхаду ў поле і культурна-бытавое абслугоўваньне пасеўшчыкаў у часе палявых работ.

Пры кожнай культпалітасьветнай установе трэба стварыць некалькі ініцыятыўных груп, брыгад-агітатараў, вярбоўшчыкаў у калгасы, брыгад па складаньні насенных і фуражных фондаў. Пры гэтым кожная група павінна мець сталы плян сваёй работы, мець кіраўнікоў і атрымліваць практычную дапамогу з боку грамадзкіх і культурных устаноў і арганізацый.

Неабходна арганізаваць спэцыяльныя бібліятэкі - перасоўкі, аб'яднаўшы сродкі ўсіх арганізацый, што адпускаюцца на спэцыяльны перасоўны фонд, упаладкаваць кнігарні, кніжныя паліцы, вылучыць неабходны кадр кніганошаў, распасьсюджаньне адпаведных кніжак праз школы, дамы

У БАЯВОЕ НАСТУПЛЕНЬНЕ ЗА ФІНПЛЯН ДРУГОГА КВАРТАЛУ!

Выкананьнем пляну мабілізацыі сродкаў забясьпечым посьпех сацыялістычнай будоўлі

Цэнтр цяжару—у фінансавай дысцыпліне

НА ПРАЦЯГУ КРАСАВІКА, МАЯ І ЧЭРВЕНЯ ДАБІЦЦА: ліквідацыі прарываў першага кварталу, поўнага выкананьня фінпляну другога

РАШУЧА УДАРЫЦЬ ПА ПАРУШАЛЬНІКАХ ФІНАНСАВАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Задачы пасьпяховага выкананьня фінансавага пляну любой арганізацыяй і вдзінага фінансавага пляну ў цэлым патрабуюць самага строгага правядзеньня ў жыцьцё фінансавай дысцыпліны. Сьнежаньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) аддаў шмат увагі пытаньню фінансавай дысцыпліны.

Трэба, аднак, канстатаваць, што пастановы партыі і ўраду аб фінансавай дысцыпліне рэдам арганізацый ня выконваюцца. Парушэньні фінансавай дысцыпліны, на жаль, яшчэ маюць месца і да гэтага часу. Ня ўсе арганізацыі добра ўсьвядомілі гаспадарча-палітычную важнасьць крэдытнай рэформы. Гаспадарчыя арганізацыі да гэтага часу яшчэ цалкам не перайшлі на новыя формы крэдытнай сыстэмы. Даволі сказаць, што НІ АДНА ГАСПАДАРЧАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ДА ГЭТАГА ЧАСУ ЯШЧЭ НЯ СКЛАЛА НАВАТ БАЛЯНСУ НА 1 КАСТРЫЧНІКА МІНУЛАГА ГОДУ.

У БЕЛРЫВЕ ў фінансавых пытаньнях пануе поўная блытаніна. БЕЛКААПСАЮЗ пераасыгнаваў вызначаныя яму лімікты на 9 млн. руб., БЕЛШВЭЙАБ'ЯДНАНЬНЕ—на 2 млн. руб. Зусім правільна робіць Дзяржбанк, калі ў адносінах да гэтых арганізацый ужывае фінансавыя абмежаваньні, скарачаючы ім крэдыты.

Ва ўмовах напружанай барацьбы за фінплян усякае нават найменшае парушэньне фінансавай дысцыпліны зьяўляецца зусім недапушчальным. Арганізацыі, якія дапускаюць гэтыя парушэньні, павінны прыцягвацца да адказнасьці. Фінансавыя і крэдытныя органы, якія ў першую чаргу адказваюць за выкананьне фінансавага пляну, павінны аб кожным выпадку парушэньня фінансавай дысцыпліны паведамляць кіруючым органам для прыняцьця мер узьдзейнасьці. Парушэньні фінансавай дысцыпліны павінны разглядацца ня як казначныя парушэньні фармальнага парадку, а як эпоснае ігнараваньне дырэктыў вышэйшых органаў.

Г. М.

ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА ШКЛОУСКІХ РАЙАРГАНІЗАЦЫЙ

(Ад наш. карэспандэнта)

Шклоўская райКК-РСІ заслухала даклад аб ходзе выкананьня фінпляну першага кварталу па раёне. РайКК-РСІ адзначыла, што рад раённых арганізацый злачынна нядбайна адносіліся да выкананьня сваіх заданьняў па мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Правааапартуністычная практыка **райкалгассаюзу, райземаддзелу і МТС прывяла да поўнага провалу кампаніі па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.** Паводле заданьня, на раёне павінна быць распаўсюджана акцый на 39.600 руб., распаўсюджана-ж толькі... на 727 руб.

Такое-ж становішча і з паступленьнем аднаразовага збору. Раённыя арганізацыі ня ўжылі мер для своячасовага спагнаньня збору. У выніку на сёньняшні дзень паступіла толькі 25 проц. налічанага.

Раённы **савет прафсаюзаў і гарсавет** не аддавалі ніякай увагі мабілізацыі сродкаў. Райпрафсавет не мабілізаваў прафсаюзную масу вакол гэтай важнейшай кампаніі. Фабрычна-заводзкія арганізацыі і камісіі садзейнасьці дзяржкредыту і ашчадсправе на мясцох нічога не зрабілі для забесьпячэньня выкананьня заданьняў па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады». На радзе прадпрыемстваў пазыкай ахоплена менш паловы рабочых. Так, па фабрыцы **«Спартак»** на пазыку падпісалася толькі 34,8 рабочых, па фабрыцы **«Барацьба»** — 32 проц. КК-РСІ кваліфікавала ўсе гэтыя факты, як вынік правааапартуністычных адносін да мабілізацыі сродкаў з боку прафсаюзных арганізацый раёну.

Раённая газэта **«Прамень камунізму»** невыстарчальна змагалася за выкананьне фінпляну, не даволі мабілізавала масы вакол гэтай кампаніі.

РайКК-РСІ абвясьціла суровую вымову загадчыку райза тав. **Шоху,** старшыні райкалгассаюзу тав. **Буйвалаву** і дырэктару МТС т. **Кляшчову** за невыкананьне заданьняў па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

За невыкананьне кантрольнага заданьня на сыстэме райкаапсаюзу старшыні апошняга тав. **Грышчанку** абвешчана суровая вымова.

За фармальна-бюракратычныя адносіны да мабілізацыі сродкаў з боку райпрафсавету, райКК-РСІ абвясьціла суровую вымову б. старшыні яго тав. **Леванту.** Абвешчана вымова таксама заг. раённага спажывецкага т-ва і кіраўніку райканторы Дзяржбанку.

Для ліквідацыі прарыву ў выкананьні фінпляну першага кварталу райКК-РСІ пастанавіла мабілізаваць і накіраваць на месцы ўвесь актыў раёну.

Н.

ЗРЫУШЧЫКІ ФІНПЛЯНУ ПРЫЦЯГВАЮЦЦА ДА АДКАЗНАСЬЦІ

ЛАГОЙСК. (Наш кар.).

Лагойскае спажывецкае т-ва зусім ня цікавіцца і ня кіруе работай сваёй сыстэмы. У цэлым радзе крам пануе безгаспадарчасьць і бясплянасьць. Ёсьць факты растрат. Так, у загадчыка кніжнай крамы Пшэўлоцкага выяўлен недахват тавараў на 2.600 руб. У загадчыка бакалейнай крамы Нісьневіча выяўлен, наадварот, лішак тавараў на 3.200 р., у крамніка Гразоўскага—лішак на 280 руб., у загадчыка базай спажывецкага т-ва Палера—лішак на 850 руб. Палер злоўжываў сваім становішчам і прысвойваў сабе каапэрацыйныя сродкі.

Запазычанасьць спажывецкаму т-ву розных устаноў і прыватных асоб складае каля 22.000 руб. Праўленьне т-ва не зварачае на гэта ніякай увагі і ня ўжывае мер для спагнаньня запазычанасьці. Мабілізацыя сродкаў для праўленьня—на апошнім плане.

Старшыня праўленьня т-ва Сільваструк займаўся самазабесьпячэньнем дэфіцытнымі прамтаварамі. Сільваструк задаваў членам праўленьня, інструктарам і крамнікам выдаваць дэфіцытныя тавары яго прыяцелям. За кароткі час Сільваструк вылаў на атрыманьне дэфіцытных тавараў... 46 асабістых запісак.

Пракуратура, якая расьследвала гэту справу, прыцягвае да суровай адказнасьці старшыню праўленьня спажывецкага т-ва Сільваструка, яго намесьніка Астрашэўскага, загадчыка базы Палера і крамніка Рольніка, Маслоўскага, Кохана, Пшэўлоцкага і Нісьневіча.

ФІНПЛЯН—ПАД ПАГРОЗАЙ

ЖЛОБІН (Наш кар.).

Раённыя арганізацыі адносяцца недапушчальна нэўважліва да мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Райкаапсаюз выканаў сваё квартальнае заданьне толькі на 4,3 проц. Па крэдытнай сыстэме паступленьне паёў і мэтавых узносаў ск а дае толькі 13 проц. пляну, па жыльлёвай каапэрацыі—18 проц.

Райкалгассаюз палец аб палец не стукнуў для распаўсюджаньня акцый Трактарацэнтру. Да гэтага часу па раёне не рэалізавана ні аднэй аблігацыі.

Аднаразовы збор спагнаны толькі на 70,2 проц. Раённыя арганізацыі праяўляюць недапушчальную літасьць да кулакоў. Даволі сказаць, што з 5.500 руб., налічаных на кулакоў па аднаразовым зборы, на сёньняшні дзень спагнана толькі... 750 руб. Сельгаспадатак с - гнаны з кулакоў толькі а 40 проц.

Трэба зараз-жа ўжыць меры для ўзмацненьня мабілізацыі сродкаў па раёне. Вінаватыя ў зрыве гэтай кампаніі павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Машніцкі.

Там, дзе мабілізацыя сродкаў—на апошнім пляне

ХАЛОПЕНІЧЫ (Наш кар.).

На працягу першага кварталу па Халопеніцкім раёне, паводле пляну, паёвінна паступіць 197.900 руб. між тым, на 23 сакавіка паступіла ўсяго 134.000 руб.

ТАКІМ ЧЫНАМ, РАЁН ЯШЧЭ НЯ ВЫКАНАЎ СВАЙГО ЗАДАНЬНЯ НА 63.500 РУБ. Сем дзён, якія засталіся да канца месяца, наўрад ці дадуць пералом у ходзе мабілізацыі сродкаў, бо раённыя арганізацыі нэўважліва адносяцца да гэтай важнейшай кампаніі.

Пазыка «Пяцігодка — за чатыры гады» рэалізавана на 13.280 РУБ. ЗАМЕСТ 34.100 РУБ., ВЫЗНАЧАНЫХ ЗАДАНЬНЕМ. Камісіі садзейнасьці дзяржкредыту і ашчадсправе на мясцох амаль зусім бязьдзейнічаюць, і ніхто іх не кантралюе.

Аднаразовага збору па раёне паступіла толькі 55 проц. Фінорганы аддавалі вельмі мала ўвагі спагнаньню збору.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай бязьдзейнасьці раённых арганізацый, якія зрываюць мабілізацыю сродкаў насельніцтва.

Патураюць кулакам

ТАЛАЧЫНО (Наш кар.).

Мабілізацыя сродкаў па Талачынскім раёне праходзіць недапушчальна марудна. Паводле вестак райфа на 20 сакавіка плян выкананы на 49 проц. Але і гэта лічба зьяўляецца сумніцельнай, бо загадчык райфа Трушчанка дасылае Наркамфіну няправільныя весткі. Так, на 10 сакавіка загадчык райфа паказаў па аднаразовым зборы суму ў 72.097 р., на справе-ж на раёне паступіла толькі 65.322 руб. Такім чынам, весткі райфа аказаліся дутымі.

Райфа і райвыканком патураюць кулаком. Замест таго, каб прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі ўнесьці належныя з іх плацяжы, загадчык райфа Трушчанка і старшыня РВК Гаўрусёў сьпісалі з кулакоў каля 16 тысяч руб.

Правааапартуністычная практыка наглядзецца таксама ў радзе сельсаветаў рабу (Друцкі, Новасельскі і інш.). У гэтых сельсаветах кулацкія гаспадаркі яшчэ нават ня выяўлены.

Спадзяюцца на самацёк

МАЗЫР. (Наш кар.). На радзе прадпрыемстваў Мазыршчыны вельмі дрэнна праходзіць мабілізацыя сродкаў. Парт'ячэйкі і заводзкія камітэты спадзяюцца выключна на самацёк.

На фанэрнай фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» з 650 пастаянных рабочых падпіскай на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» ахоплена толькі 536 чалавек. На фабрыцы працуе 460 сэзонных рабочых, але сярод іх ніякай працы на рэалізацыі пазыкі не вядзецца.

Каса ашчадкасьці, якая існуе пры фабрыцы, амаль зусім не працуе. Замест прыліву ўкладаў, у касе за апошні час ёсьць значны адліў. Камісія садзейнасьці дзяржкредыту і ашчадсправе існуе толькі на паперы.

Такое-ж становішча і на фабрыках «Пралетары» і «Дрэваапрацоўшчык». Значная частка рабочых гэтых фабрык не ахоплена падпіскай.

Мазырскі РК КП(б)Б павінен неадкладна абсьледаваць работу фабрычна-заводзкіх арганізацый у галіне мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Ашчадкасы Барысаўшчыны бязьдзейнічаюць

БАРЫСАЎ (Наш кар.). Ашчадкасы Барысаўшчыны працуюць зусім дрэнна. Яны выканалі свае заданьні толькі на 35 проц. На фабрыках і заводах Барысаўшчыны ашчадсправе аддасца вельмі мала ўвагі. Сакратар партыйнага калектыву ф-кі «Чырвоная Бярэзіна» нават ня ведае кантрольных лічбаў свайго прадпрыемства па ўцягненьні ўкладаў.

У сельсаветах і калгасах камісіі садзейнасьці дзяржкредытаў і ашчадсправе бязьдзейнічаюць, а ў радзе калгасаў іх зусім няма.

З усіх ашчадкас раёну толькі ашчадкаса № 23 выканала сваё заданьне на 120 проц.

Прафсаюзы - тварам да фінпляну!

Прэзыдыум ЦСПСВ адзначыў, што прафарганізацыі да гэтага часу не аддавалі належнай увагі мабілізацыі сродкаў насельніцтва. У радзе прафарганізацый паглядзаліся дэмабілізацыйныя настроі, недапушчальная нядбайнасьць у мабілізацыі ўкладаў рабочых мас на выкананьне фінансавага пляну.

ЦСПСВ абавязаў прафарганізацыі разгарнуць бальшавіцкія тэмпы работы з тым, каб забясьпечыць ліквідацыю прарываў першага кварталу і выкананьне фінпляну другога кварталу. Адказнасьць за правядзеньне гэтай работы ўскладзена на старшынь ЦП саюзаў і гаррайпрафсаветаў.

Па Савецкай Беларусі

Тэрмінова пачаць будаўніцтва МТС

Рэалізацыю акцый Трактарацэнтру—на баявыя тэмпы

Пастанова Эканамічнай Нарады БССР

Заслухаўшы даклад аб ходзе будаўніцтва мацына-трактарных станцый і рэалізацыі акцый Трактарацэнтру, Эканамічная Нарада БССР адзначае, што, ня гледзячы на значныя посьпехі ў справе калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у раёнах будаўніцтва машына-трактарных станцый (на 20 сакавіка 1931 году арганізавана 335 новых калгасаў і ў існуючыя калгасы ўвайшло 10.165 новых гаспадарак, праведзеньне дагаворнай кампаніі на 86 проц., укамплектаваньне штатаў МТС агранамамі і іншымі работнікамі) і на здавальняючае правядзеньне курсаў для падрыхтоўкі кадраў масавых кваліфікацый,—у рабоце беларускага аддзяленьня Трактарацэнтру па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі ёсьць вялікія недахопы, якія ў асноўным выяўляюцца:

а) у спазьненьні са складаньнем вытворчых плянаў па МТС і няпоўным выкананьні заданьня па ахопе плошчы пад пасевы ільну (60 проц. вытворчай праграмы);

б) у раёнах дзейнасьці машына-трактарных станцый насенны фонд сабраны калгасамі толькі на 62,7 проц.;

в) рамонт трактарнага парку машына-трактарных станцый выкананы на 80% і трактараў, якія знаходзяцца ў паасобных калгасах і каапэрацыйных арганізацыях,—на 51 проц. Забясьпечанасьць запаснымі часткамі зусім недавальняючая;

г) станцыянарнай і перасовачнай тарай МТС забясьпечваюцца вельмі марудна і частка МТС, ня гледзячы на пастановы Савету Народных Камісараў аб свалчасовым іх забесьпячэньні тарай і бакамі, імі не забясьпечаны;

д) на 20 сакавіка 1931 году галавое заданьне па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру выкананa толькі на 10,9 проц., а квартальнае—на 21,6 проц. Лічыць, што такі ход мабілізацыі сродкаў насельніцтва на будаўніцтва МТС зьяўляецца зусім нездавальняючым і не забясьпечвае патрэбных тэмпаў арганізацыі і разгортваньня мацына-трактарных станцый;

е) затаўка будаўнічых матар'ялаў для мацына-трактарных станцый, асабліва лесу і цэглы, праведзена не ў выстарчальным разьмеры і патрэбнае зрывам будаўніцтва МТС;

ж) раённыя арганізацыі і кіраўніцтвы МТС не зварачалі патрэбнай увагі на будаўніцтва МТС, распаўсюджаньне акцый Трактарацэнтру, падрыхтоўку будаўнічых матар'ялаў і г. д. і не вялі масавай работы на папулярызацыі значэньня МТС у справе перабудовы сельскай гаспадаркі на новых сацыялістычных падставах.

Выходзячы з паказанага, Эканамічная Нарада БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і ўпаўнаважанага Трактарацэнтру скончыць да 5 красавіка 1931 году дагаворную кампанію, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на выкананьне заданьня па ільне.

2. Лаўчыць Народнаму Камісарыяту Зямляробства, Белкалгасцэнтру і ўпаўнаважанаму Трактарацэнтру да 10 красавіка 1931 году скончыць сьпіцку насеннага фонду ў калгасах раёнаў дзейнасьці МТС і праверыць ход ачысткі, ускожасьць і кандыцыйнасьць насеньня, а таксама паралак яго захаваньня.

3. Абавязаць Белкалгасцэнтр і ўпаўнаважанага Трактарацэнтру тэрмінова перавесьці ўсе майстэрні для рамонту трактараў на трохзьменную работу.

4. Паслаць на месцы работнікаў для хутчэйшага накіраваньня трактараў у майстэрні. Асоб, якія будуць тармазіць дастаўку трактараў у майстэрні для рамонту, прыцягваць да адказнасьці, як за зрыў веснавой пасеўнай кампаніі.

5. Абавязаць Белкаапсаюз пазычыць для патрэб МТС 300 бочак.

Даручыць Белсампрамсаюзу да 1 мая 1931 году зрабіць 1.200 бочак, а Лесбелу да 5 красавіка 1931 году забясьпечыць Белсампрамсаюз патрэбнай колькасьцю драўніны.

6. Даручыць беларускай канторы Мэталялому на працягу 7 дзён вывіць налўнасьць бакаў і перадаць іх Белкаапсаюзу і Трактарацэнтру. Абавязаць Белкаапсаюз устанавіць бакі ў тых вызначаных Наркамземам пунктах, у якіх яны яшчэ да гэтага часу не устаноўлены, а ўпаўнаважанага Трактарацэнтру — не пазьней, як праз дэкаду, скончыць устаноўку дадатковых бакаў.

7. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, раённыя аддзяленьні Дзяржбанку, райкалгассаюзы і дырэктароў МТС сканцэнтраваць усю увагу на пытаньні мабілізацыі сродкаў насельніцтва і дабіцца ў бліжэйшыя дні рашучага пералому ў справе рэалізацыі акцый Трактарацэнтру з такім разьлікам, каб квартальныя заданьні на другі квартал былі цалкам выкананы і пакрыты прарывы першага кварталу, для чаго ўзмацніць масавую растлумачальную работу, стварыць ударныя брыгады і ініцыятыўныя групы і разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж раёнамі і мацына-трактарнымі станцыямі.

8. Даручыць упаўнаважанаму Трактарацэнтру і Белсельбуду неадкладна скончыць загатоўку будаўнічых матар'ялаў для МТС і тэрмінова дабіцца нарадаў на ўсе будаўнічыя матар'ялы. Тэрмінова пачаць і да 15 верасьня 1931 году скончыць будаўніцтва МТС.

9. Прыняць да ведама паведамленьне прадстаўніка Трактарацэнтру—т. Дзергцярова аб тым, што з ліку 32 трактараў, прызначаных для койданаўскай МТС, 29 ужо сабрана і адрамантавана, а іншыя своячасова будуць падрыхтаваны.

Старшыня Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады
С. КЕНДЫБЭЙ.

Ня зрывэць забесьпячэньня рабочых малочнымі прадуктамі

ЦСПСВ канстатаваў, што выкананьне пляну кантрактацыі і забесьпячэньне рабочых гарадоў малаком і малочнымі прадуктамі сарвана. Загатоўчыя арганізацыі—Белкаапсаюз, Белсельтрэст, Белмалжывёпасаюз—бязьдзейнічалі, на мясцох малако разбазарвалася. Наркамгандлю слаба кіраваў загатоўкай малочных прадуктаў. Раённыя арганізацыі нічога не зрабілі, каб давесьці цьвёрдыя заданьні да кулацкіх гаспадарак.

ЦСПСВ зьвярнуўся ў ЦКК-НК РСІ з просьбай праверыць прычыны невыкананьня загатоўчымі арганізацыямі ЦК рэктыў партыі і ўраду аб кантрактацыі малака. ЦСПСВ паставіў тэрмінова накіраваць рабочыя брыгады ў раёны, каб дапамагчы мясцовым арганізацыям правесьці кантрактацыю малака.

Назначэньні

— Прэзыдыум ЦВК БССР аслабаніў тав. **Абрамсона М. Я.** ад абавязкаў намесьніка народнага камісара забесьпячэньня БССР і назначыў яго намесьніка народнага камісара фінансаў БССР.

— СНК БССР аслабаніў тав. **Гольдштэйна Р. Э.** ад абавязкаў намесьніка старшыні і члена прэзыдыуму Дзяржпляну БССР у сувязі з пераходам яго на іншую работу.

— СНК БССР аслабаніў тав. **Бондара Г. П.** ад абавязкаў члена калегіі НКВ БССР і назначыў яго членам прэзыдыуму Дзяржпляну БССР.

Паведамленьні

1-га красавіка, у 7 гадз. вечара, у пам. арг. інстр. сэктару ЦСПСВ (Дом Працы, 2-гі паверх, пак. № 4), адбудзецца нарада добраахвотнікаў арг. інстр.

Левін Н. Д., Левін Ш. Х., Гліот Л. Ш., Мажэйка К. М., Вілка К. Д., Немавіцкі М. Ш., Гінзбург В. Л., Гантман І. Г., Копвісэр — зав. «Бальшавік». Гехт Е., Гавштэйн, Спэцкоў В., Гэйжан С. А., Тарасевіч С., Севашціна С.— зав. «Камунар». Пэтлах Ф. Ш., Цеўлоўскі К. І., Барысэвіч В., Рапапорт Ш. Р., Красэр Е. Х. — дав. «ДА». Сьмірноў П. П., Марон Ф. Л., Бурко П. І., Рафаловіч М. С., Грынчук Л. Ф., Шмідзік В. В., Гарланаў Д. І., Чыркун А. А., Собалеў К. І. — Эльвод. Лісоўская К. С., Сконін А., Якубоўскі Б., Чэрник Н., Сабіла О., Воранецкі С., Гарбачоў А., Заяц Р., Ганцкевіч С. — шклозавод «Пралетары». Гаралдзеўскі О. Я. — зав. «Камунар». Мэламад Н. В. — Эльвод. Фрыдлянд С. І. — трубачыст. Штубрына Ф., Бокштэйн Е. М.—друк. «Эльвод». Тарповер Л. Г., Зысман І. Д. — склад сырав. ВКО. Вішмунскі Л. Г. — калб. ф-ка Белмяса. Фурлетаў О. А. — ф-ка «Пралетарская Перамога». Шамэс В. Л. Лельчук С. І. — зав. «Бальшавік». Залатароў — шчотачная фабрыка. Зімієнка С. А. — кантора пошта-тэлеграф. Шэршэнь, Ацэцкі А. Ф., зав. «Бальшавік».

— **Дом Камуністычнае Асьветы.** 1-га красавіка, у 7 гадзін веч., пакой № 19. — групавая кансультацыя для кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў.

— 2 красавіка, у 6 гадз. веч., у Культпрапе ЦК КП(б)Б склікаецца мэтадбюро. Выклікаюцца т. т. Луг'е, Поташ, Ошараў, Клімковіч, Янкевіч, Гімэльфарб і Ўлазаў.

— **Менгарком КП(б)Б** склікае на 2-е красавіка, у 6 гадз. веч. партнараду калектываў і ячэек КП(б)Б усіх навучальных устаноў (інстытутаў, факультэтаў, тэхнікумаў і розных курсаў) г. Менску, з парадкам дня: 1. Аб перавыбарах бюро ячэек КП(б)Б, 2. Аб становішчы і задачах перабудовы партработы ў навучальных установах. На нараду павінны зьявіцца: чл. бюро парткалектываў, сакратары ячэек КП(б)Б, кіраўнікі-камуністы аддзяленьняў навучальных устаноў, старшыні выканбюро, прафкомаў—камуністы і выкладчыкі-камуністы. Нарада адбудзецца ў залі пасяджэньняў Менгаркому КП(б)Б (3-ці паверх).

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр
СЁНЬНЯ адкрыты спэктакль
Вішнеўскі „ПЕРШАЯ КОНЛАЛ"
Пачатак у 8 гадз. веч.

Гукавы кіно-тэатр „БЕЛЕСКАЯ ЗОРКА"
НЕ ХАЧУ ДЗІЦЯЦІ.
Кіно-хроніка Союзкіно № 11.
Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м.
КАСА—з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура"
УЗДУВАЙЦЕ ГОРНЫ.
Кіно-хроніка Союзкіно № 10.
Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
КАСА—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал"
Замежны фільм ТРЫ ДЖЫГІ
Зьвыш праграмы—хроніка Саюзкіно № 9
Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз.
Каса з 4 г. 30 м.

КІНО „Агітпункт"
2-гі тыдзень 1-гі
РАЗВОД у 7 частках
Пач. 1 сэансу ў 6 г. Каса—з 4 гадз.

КІНО „Жны Піонер"
Цікавы фільм АБРЭК ЗАУР.
Кіно-аповесьць у 10 частках.
Пачатак сэансу ў 1 гадз. дня.
Каса—з 11 г. 30 м.

КІНО „Спарта"
2-гі тыдзень 2-гі
ТАРАС ТРАСІЛА трагедыя у 7 частках
Пач. у 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
Каса—з 5 гадз.

1-га красавіка у 7 гадзін вечара у залі Бел. Акад. Навук
АДБУДЗЕЦЦА
пратяг сходу па грамадзкім агляду дзейнасьці польсэктару Беларускай Акад. Навук і яго супрацоўнікаў.
Запрашаюцца: рабочыя прадпрыемстваў г. Менску 6-я і 33-я школы, пользадзелы разфіку і БДУ, працаўнікі газ. „Орка", НКАсветы, польсэкт-р БДВ, польсэдтэхнікум і супрацоўнікі БАН.
Камісія ЦКК-РСІ.

1-га красавіка г. г. у 8 гадзін вечара (Універсітэцкі гарадок, гаспадны корпус, аудыторыя № 301)
СКЛІКАЕЦЦА
аб'яднаны пасяджэньне катэдраў і вытворчых камісій кіраўніцтва факультэту „Гаспабуд і Права" БДУ
для разгляду праекту новага навучальнага пляну.
Яўка ўсіх навуковых працаўнікоў і членаў вытворчых камісій абавязкова.
ДЭКАНАТ.

І-шы Усебеларускі зьезд саюзу рабочых машына-трактарных станцый і батраў
АДКРЫВАЕЦЦА 1-га КРАСАВІКА
ў Цэнтральным доме калгаснікаў (б. Дом Селяніна)—рог Чырвонаармейскай вуліцы і Карла-Маркса ў 7 гадзін. вечара.
Фракцыя зьезду—там-жа, у 6 гадзін. вечара.

Даводзім да ведама ўсіх дастаўшчыкаў МЦРК, што во ўсіх дасылаемых рахунках павінна быць абазначана пазыкаю, якімі гадзінамі Менгарсобгосгандаг адпускаць, напрыклад, крама № 1, ларык № 1, сайгас «Санжаны», сталовая № 1, траспарт, хлебазавод і г. д. Без паказаньня пэўнай адзінкі рахункі банкам аплачвацца ня будуць.
Правленьне.

УСЕБЕЛАРУСКІЯ КУРСЫ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ
5-га красавіка г. г. у Менску адкрываюцца
Усебеларускія дэкадныя курсы інструктароў райкалгассаюзаў
ПА АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ.
Кожны райкалгассаюз павінен накіраваць да 5-га красавіка г. г. свайго інструктара па арганізацыі працы ў Белкалгасцэнтр (там дзе яго няма, трэба ведамляць вышэйшае).
Утрыманьне курсантаў і праезд назад аплачваюцца за кошт Калгасцэнтру.
Калгасцэнтр БССР.

Праводзіцца чыстка апарату „ОГИЗ'а" РСФСР і аддзелу падпіскі.
Камісія ЦКК-РСІ звяртаецца да ўсіх рабочых і служачых, а таксама да ўсіх прадпрыемстваў прыйсьці на дапамогу выкрыцьцю ўсе недахопы ў рабоце гэтай установы. Здавайце матар'ялы на імя камісіі па чыстцы па адрасе: Савецкая, 77, магазын «ХПО,Ів».
Апускайце вашы матар'ялы ў скрынкі, якія ёсьць ва ўсіх кнігарнях «ОГИЗа».

ПАСТАНОВА
НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ПРАЦЫ БССР
23 сакавіка 1931 г. № 13-81. Гор. Менск.
«Пра меры ўзьдзеяньня на кіраўнікоў устаноў і асоб, якія ўхіляюцца ад выкананьня дырэктывы Наркамправы БССР аб узмацненьні Дзяржбанку і Трактарацэнтру РАХУНКОВЫМІ РАБОТНІКАМІ».
На гледзячы на дырэктывы СНК СССР, БССР і Наркамправы БССР аб узмацненьні рахункового апарату Дзяржбанку і МТС, работа зрываецца з прычыны таго:
а) што некаторыя РВК і гарсаветы адмаўляюцца праводзіць перакідку рахунковых работнікаў са сваіх гадавой у іншыя;
б) ні аўдзікі ўстаноў адмаўляюцца аслабаніць работнікаў, падлягаючых перакідваньню;
в) падлягалыя перакідваньню работнікі ўпарта ўхіляюцца ад перакідваньня іх у іншыя ўстановы.
Улічваючы неабходнасьць узмацненьня апарату Дзяржбанку, асабліва у сувязі з пастановай СНК СССР № 229 ад 20-III-31 г. і МТС, Наркамправы БССР пастанаўляе:
1. У дадзены тэрмін скончыць усю работу па правядзеньні перакідваньня рахунковых работнікаў у апарат Дзяржбанку і Трактарацэнтру па нарадах, выданых Наркамправы БССР.
2. Мясцовыя органы працы, кіраўнікоў устаноў, якія затрымаюць рахунковых работнікаў з іншых 5-ці дзён пасьля выданьня гэтай пастановы аб накіраваньні іх у апарат Дзяржбанку ці МТС, прыцягваць да крымінальнай адказнасьці, як за парушэньне пляновага кіраваньня рабсілы, па арт. 141 разьдзел I Крымінальнага Кодэксу БССР («Савецкая Беларусь» 12-III-31 г.).
3. Асоб якія ўхіляюцца ад перакідваньня у апарат Дзяржбанку ці Трактарацэнтру, пасьля атрыманьня пара у НКПВ на працягу 5 дзён прыцягваць да адказнасьці па арт. 102, разьдзел I Крымінальнага Кодэксу БССР («Савецкая Беларусь» 12-III-31 г.).
Нам. наркамправы БССР ПУШЧЫН.
Згодзена: Наркамюстыцы ЛЯЎКОЎ.

Да ведама ўсіх! Калектыўная падпіска на пазыку «Пяцігодка за 4 гады» і афармляньне першымі узносамі ПРЫМАЕЦЦА усімі крэдытнымі ўстановамі да 3-га красавіка г. г.
Калектывы, здаўшыя падпісныя лісты, ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ У 1-м ТЫРАЖЫ, які адбудзецца 3-га красавіка 1931 г.
КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТУ БССР.

Дом Камасьбеты імя Карла Маркса.
СЁНЬНЯ, у 10 гадз.,—
ДАКЛАД тав. ШЭКТАРАЗА
для пр. і камсам. актыву
„Задачы перавыбораў і перабудовы парторганаў".
Пасьля д. ладу—КАНЦЭРТ.
Білеты ў гарк. м. 6-б і ў чытальні Дому.

У чацьвер, 2 красавіка, у 7 гадз. веч. праўленьне т-ва „Прыяльнікі дзяцей" (Савецкая, 4) склікае актыў ячэек т-ва па пытаньні правядзеньня
МЕСЯЧНІКА ДАПАМОГІ ДЗІЦЯЧЫМ ДАМОМ.
Фабкомы і мясцкомы п вінны забясьпечыць акуратную яўку прадстаўнікоў ячэек.
ПРАЎЛЕНЬНЕ.

ПАСТАНОВА № 4-89
Прэзыдыуму Менскага Гарэдзкога Савету
ад 27-III 1931 г.
Аб парадку разьмеркаваньня дроў, прыбываючых у Менск.
У мэтах правільнага разьмеркаваньня дроў паміж прадпрыемствамі і установамі гораду, прэзыдыум гарсавету пастанаўляе:
1. Прапанаваць Лесбелу ўсе дровы і дружаць у вадрас гарсавету.
2. Склясьці тройку пры Гарсавеце з прадстаўнікоў ад гарсавету нам. старшыні тав. Бярмоўс кага, гарадзкой РСІ тав. Налеа і Лесбелу тав. Левіна, якой даручыць кожны дзень не пазьней 9 гадзін раніцы разьмяркоўваць прыбыўшыя дровы.
3. Абавязаць Саюзтранс кожную раніцу не пазьней 9 гадзін прадстаўляць тройцы весткі аб колькасьці прыбыўшых дроў.
4. Разьмеркаваньне тройкі зьяўляецца канчатковым і абсарджаньню не падлягае.
5. Гэта пастанова не распаўсюджваецца на вазвед і чыгунку, якім дровы адгружаюцца непасрэдна ў іх адрасы.
Старшыня ВАЛОДЗЬКА. Сакратар ШАЛКАВЕЦ.

БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ
ПАВЕДАМЛЯЕ, што
АДКРЫТ ПРЫЁМ
на 3-мясячныя рахункаводныя банкаўскія курсы, якія існуюць пры Віцебскім, Магілеўскім і Бабруйскім аддзяленьнях Дзяржбанку.
На курсы прымаюцца скончышыя 7-гадку—дзеці рабочых, калгасьнікаў, бедняко-сялян, дамабілізаваныя чырвонаарменцы.
Усе прынятыя на курсы забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй у разьмеры 35 руб. у м-ц. Усе скончышыя курсы будуць Дзяржбанкам накіраваны на працу.
Заявы прымаюцца ва ўсіх раённых аддзяленьнях Дзяржбанку ДА 15-га КРАСАВІКА г. г.
Аб дні пачатку заняткаў будзе паведамлена кожнаму залічанаму на курсы асобна.
Кіраўнік Белканторы Дзяржбанку ФЭЛЬДМАН.
Заг. аддзелам выдраў СІДАРОВІЧ.

ПРАПАЛА
аўчарка, кабель, воўна, масьці, вялікі росту. Прашу асоб, хто ведае, паведаміць па тэлефону 17-59. Утойваньне прасьледуецца па закону.

ГАДАВАЛЬНІК КУПЛЯЕ САБАК
намецкіх аўчарак і «добер-мэнчаў». Прапановы па тэлефоне 8-01 ад 9 да 17 г. штодзеньня.

Патрэбен вопытны ст. бухгальтар
Аплата па згодзе.
Адрас у канторы выд-ва «Зьвязды».

Беларускай канторы „МЭТАЛЯЛОМ" ПАТРЭБНЫ БУХГАЛЬТАРЫ, ПАМБУХГАЛЬТАРЫ, картатэчнікі.
Пісьмовыя прапановы накіраваць па адрасе: Менск, Савецкая № 65.

ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА са стажам, якая-б вела дела беларускую мову. Аплата па згодзе. Зьвяр. пушча: Менск, в. Карла Маркса, 8 (рэда ция газэты „Чырвоная зьмена").

Кошт публікацыі 1р. АБ ЗГУБЕ і дакуманту

Менск, друкарня «Зьвязды».
Галоўлітбал № 337